ПРАЛЕТАРЫІ УСІХ КРАІН, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

СЕРАДА, 6 ЛІПЕНЯ 1938 г. № 37 (379)

ЛІТАРАТУРА і МАСТАЦТВА

Орган праўлення Саюза савецкіх пісьменнікаў БССР і Упраўлення па справах мастацтваў пры СНК БССР

ПАЗЫКА ТРЭЦЯЙ СТАЛІНСКАЙ ПЯЦІГОДКІ

Наш урад, ідучы насустрач шматлікім пажаданням рабочых і калгаснікаў, выпусціў Дзяржаўную Пазыку Трэцяй Пяцігодкі (выпуск першага года). Гэтае паведамленне сустрэта ўсімі працоўнымі нашай краіны з вялікім уздымам і радасцю. На заводах і фабрыках, у калгасах і соўгасах, на ўсіх прадпрыемствах, ва ўсіх установах поўным ходам ідзе падпіска на новую пазыку.

Нідзе ў свеце няма і не можа быць такіх, як у нас, адносін да дзяржаўных пазык, бо толькі ў краіне соцыялізма інтарэсы дзяржавы поўнасцю супадаюць з інтарэсамі ўсяго народа. Кожны совецкі грамадзянін уласнымі вачыма бачыць сусветна-гістарычныя перамогі соцыялізма. Ен бачыць і адчувае іх у няўхільным росце гаспадарчай магутнасці і абароназдольнасці нашай краіны, у безупынным уздыме добрабыту народа.

Совецкі народ падпісваецца на пазыку, таму што ў нашай краіне канчаткова перамог соцыялізм, увайшоў у быт і жыццё кожнага працоўнага. Соцыялістычная рэволюцыя «дала народу не толькі свабоду, але магчымасць заможнага і культурнага жыцця» (І. Сталін).

Багата наша краіна, шчасліва і свабодна жывуць яе народы. Поўным ходам працуюць яе фабрыкі і заводы, выдатныя ўраджаі спеюць на яе неабсяжных палетках. І ўсе незлічоныя багацці яе належаць свабоднаму народу.

З радасным задавальненнем аглядаецца совецкі народ на слаўны шлях, пройдзены краінай. З пачуццём гордасці падлічвае ён вынікі выдатных перамог, якія запісаны ў найвялікшым дакуменце гісторыі — Сталінскай Канстытуцыі.

Непазнавальнаю стала і наша Совецкая Беларусь. Пад кіраўніцтвам комуністычнай партыі, пры брацкай дапамозе слаўнага рускага народа, у дружнай шматнацыянальнай сям'і народаў Совецкага Саюза яна з былой царскай калоніі ператварылася ў квітнеючую рэспубліку. За годы сталінскіх пяцігодак у БССР пабудаваны дзесяткі новых прадпрыемстваў. Працоўныя Беларусі, па праву, ганарацца такімі выдатнымі заводамі і фабрыкамі, як Гомельскі сельмаш, Белдрэс, Віцебская швейная фабрыка «Сцяг індустрыялізацыі», Магілеўская шоўкавая, Бабруйскі дрэваапрацоўчы камбінат, шклозавод імя Сталіна, Крычаўскі цэментны і мноствам іншых.

Сваіх слаўных перамог совецкі народ дасягнуў пад кіраўніцтвам партыі Леніна — Сталіна. Працоўныя нашай радзімы беззаветна адданы комуністычнай партыі, якая на працягу ўсёй сваёй гісторыі стаіць на варце інтарэсаў народа.

Кожны дзень у нас прыносіць новыя перамогі, перамогі, якія напаўняюць сэрцы совецкіх патрыётаў гордасцю за сваю бацькаўшчыну. За адны суткі нашы гордыя сокалы Кокінакі і Брандзінскі праклалі шлях з канца ў канец нашай неабсяжнай радзімы. Тры мужныя лётчыцы сваім бліскучым пералётам Севастопаль — Архангельск паставілі новы рэкорд у гісторыю нашай авіяцыі. Совецкія піяністы сваім бліскучым майстэрствам занялі першае месца ў свеце.

Усіх гэтых грандыёзных поспехаў совецкі народ дасягнуў у бязлітаснай барацьбе з заклятымі ворагамі народа. Слаўная совецкая разведка пад кіраўніцтвам Нікалая Іванавіча Ежова, апіраючыся на падтрыманне ўсяго совецкага народа, разграміла і знішчыла зміяіныя гнёзды трацкісцка-бухарынскіх фашысцкіх бандытаў. Але гэта яшчэ не азначае поўнага знішчэння ўсякіх спроб ворагаў нанесці шкоду соцыялістычнаму будаўніцтву. Ні на хвіліну нельга забывацца мудрага ўказання таварыша Сталіна — «...пакуль існуе капіталістычнае акружэнне, будуць існаваць у нас шкоднікі, шпіёны, дыверсанты і забойцы, якія засылаюцца ў нашы тылы агентамі замежных дзяржаў».

Вось чаму працоўныя, падпісваючыся на новую пазыку, добра ведаюць, што іх сродкі пойдуць таксама на ўмацаванне нашай непераможнай Чырвонай Арміі і Ваенна-Марскога Флота, якія ў любы момант дадуць рашучы адпор ворагу і знішчаць яго на той тэрыторыі, адкуль ён памкнецца прысці.

У краінах капіталізма буржуазія выкарыстоўвае пазыкі як сродак абрабавання працоўных. Там сродкі, якія выціскае капіталізм з працоўных, ідуць на падрыхтоўку драпежніцкіх войн, для фінансавання крывавых авантур фашызма. Вядома, што такія пазыкі не могуць быць папулярнымі ў народзе, бо яны супроць яго інтарэсаў.

Толькі ў нашай краіне, дзе кожны працоўны рубель ідзе на новыя перамогі соцыялістычнага будаўніцтва, дзяржаўныя пазыкі сустракаюць усеагульнае падтрыманне працоўных. Яркім паказальнікам патрыятызма і аднадушнасці совецкага народа з'явілася размяшчэнне Пазыкі ўмацавання абароны Саюза ССР, якая была горача падтрымана ўсім народам і з'явілася грозным папярэджаннем агідным здраднікам радзімы — агентам фашызма, хацеўшым рэстаўрыраваць капіталізм у нашай краіне.

Новая пазыка сустрэта працоўнымі яшчэ з большым энтузіязмам. Пра гэта з усёй пераканаўчасцю сведчыць усё ўзрастаючая лічба падпіскі. Многія заводы, фабрыкі, установы і ваенныя часці ўжо скончылі падпіску.

Велічэзныя задачы пастаўлены перад нашай краінай народнагаспадарчым планам 1938 года. Гэты план вызначае далейшае развіццё і ўмацаванне соцыялістычнага грамадства, рост матэрыяльнага і культурнага ўзроўню народаў СССР. Выпуск прамысловай прадукцыі сёлета павялічыцца на 15,3 проц. у параўнанні з мінулым годам, прадукцыя сельскай гаспадаркі — на 14 проц. У гэтым годзе арганізуецца 500 новых машынатрактарных станцый. Капітальныя ўкладанні ў народную гаспадарку ўзрастуць больш чым на 30 проц. у параўнанні з папярэднім годам. 1938 год будзе адзначаны далейшым ростам добрабыту працоўных. Фонд заработнай платы павялічваецца на 12 млрд. рублёў і ўзрасце да 94 мільярдаў. У гэтым годзе насельніцтва атрымае тавараў на 15,5 мільярдаў рублёў — больш, чым у мінулым годзе. Тысячы новых жыллёвых дамоў, школ, больніц і ясляў будуць пабудаваны ў бягучым годзе. Дзяржаўны бюджэт вырасце ў параўнанні з 1937 годам амаль на 20 мільярдаў рублёў.

Не можа быць ніякага сумнення ў тым, што новая дзяржаўная пазыка будзе рэалізавана яшчэ з большым поспехам, чым ранейшыя пазыкі. Працоўныя нашай краіны з радасцю аддаюць у пазыку дзяржаве свае зберажэнні.

Падпіска праводзіцца пад лозунгам: двух-трохтыднёвы заработак — у пазыку дзяржаве. Працоўныя Совецкага Саюза не раз паказвалі сваю арганізаванасць і свядомасць і заўсёды перакрывалі ўстаноўленую ўрадам суму выпуску пазыкі. Няма сумнення, што і цяпер, ва ўмовах велізарнага росту фонда зарплаты і прыбыткаў, совецкая інтэлігенцыя і асабліва — работнікі літаратуры і мастацтва — пісьменнікі, кампазітары, артысты і музыканты, з гонарам выканаюць свой пачэсны абавязак перад соцыялістычнай дзяржавай, якая стварыла ўсе ўмовы для нашай плённай працы, для магутнага росквіту соцыялістычнай культуры, літаратуры і мастацтва.

ПРЫВІТАННЕ ГОРДЫМ СОКАЛАМ КРАІНЫ СОЦЫЯЛІЗМА!

СЕВАСТОПАЛЬ—АРХАНГЕЛЬСК

2 ліпеня 1938 года ў 4 гадзіны 36 мінут па маскоўскаму часу на аднаматорным гідрасамалёце «МП-1» ваенныя лётчыцы — старшы лейтэнант Поліна Дзянісаўна Осіпенка, старшы лейтэнант Вера Федараўна Ламака і штурман-лейтэнант Марына Міхайлаўна Раскова пачалі беспасадачны пералёт па маршруту Севастопаль—Кіеў—Ноўгарад—Архангельск.

У 15 гадзін 09 мінут тав. Осіпенка благапалучна зрабіла пасадку на Холмаўскім озеры (15 кілометраў паўднёвей Архангельска).

Увесь шлях адлегласцю ў 2.416 кілометраў, пройдзен самалётам «МП-1» за 10 гадзін 33 мінуты з сярэдняй хуткасцю 228 кілометраў у гадзіну.

На ўчастку Гомель — Віцебск—Вялікія Лукі—Ноўгарад палёт праходзіў у воблаках; унебачнасці зямлі.

Ад Водлозера да Архангельска самалёт ішоў пад воблакамі, над воблакамі і большай часткай у воблаках.

Совецкія лётчыцы Осіпенка, Ламака і Раскова бліскучым чынам выканалі пастаўленую перад імі задачу.

З АРХАНГЕЛЬСКА 3 ліпеня 1938 г. **Масква, Крэмль.**

Таварышу СТАЛІНУ

ДАРАГІ ТАВАРЫШ СТАЛІН!

ЦЯЖКА ЗНАЙСЦІ СЛОВЫ, КАБ ВЫКАЗАЦЬ ПАЧУЦЦЕ РАДАСЦІ, ЯКОЕ ПЕРАЖЫВАЕМ МЫ ЗАРАЗ, АТРЫМАЎШЫ ВАШАЕ ВІНШАВАННЕ, ПОЎНАЕ БЯЗМЕЖНАЙ ЛЮБВІ І КЛОПАТУ АБ НАШАЙ АВІЯЦЫІ І ЯЕ ЛЮДЗЯХ. ПРАЛЯТАЮЧЫ НАД ГАРАДАМІ, КАЛГАСНЫМІ ПАЛЯМІ НАШАЙ НЕАБСЯЖНАЙ І ШЧАСЛІВАЙ РАДЗІМЫ, ЗЛУЧАЮЧЫ ПА ПАВЕТРУ ДВА МОРЫ, МЫ НЕСЛІ У СВАІХ СЭРЦАХ ВАШАЕ ІМЯ, ІМЯ ТВАРЦА САМАЙ ДЭМАКРАТЫЧНАЙ У СВЕЦЕ КАНСТЫТУЦЫІ, АДКРЫЎШАЙ ПЕРАД НАМІ ЎСЕ ШЛЯХІ ШЧАСЛІВАГА І СВАБОДНАГА ЖЫЦЦЯ, ДАЎШАЙ НАМ ПРАВА ДАБІЦЦА САМАГА ВЯЛІКАГА ШЧАСЦЯ СОВЕЦКАГА ГРАМАДЗЯНІНА — АТРЫМАЦЬ ВАШАЕ ВІНШАВАННЕ І ХАЦЯ-Б У ДУМКАХ МОЦНА ПАЦІСНУЦЬ ВАШУ РУКУ.

ПАЛІНА ОСІПЕНКА, ВЕРА ЛАМАКА, МАРЫНА РАСКОВА.

З АРХАНГЕЛЬСКА 3 ліпеня 1938 г. **Масква, Крэмль**

Таварышам СТАЛІНУ, МОЛАТАВУ, ВАРАШЫЛАВУ, КАЛІНІНУ, КАГАНОВІЧУ, ЕЖОВУ

ВАШАЕ ВІНШАВАННЕ УСЯЛЯЕ У НАШЫ СЭРЦЫ ПАЧУЦЦЕ ВЕЛІЗАРНАЙ РАДАСЦІ. НАШ СКРОМНЫ ПОСПЕХ ТОЛЬКІ АДЗІН З ПРЫКЛАДАЎ ТАГО, НА ШТО ЗДОЛЬНА СОВЕЦКАЯ ЖАНЧЫНА, ВОЛЬНАЯ І СІЛЬНАЯ, ГОРДАЯ І ШЧАСЛІВАЯ, АКРЫЛЕНАЯ СТАЛІНСКІМІ БАЦЬКОЎСКІМІ КЛОПАТАМІ, І МЫ ДАЕМ ВАМ СЛОВА ПРАЦАВАЦЬ, НЕ СКЛАДАЮЧЫ РУК, ДАБІВАЦЦА НОВЫХ І НОВЫХ ПЕРАМОГ, А КАЛІ ПАТРЭБНА БУДЗЕ, ГАТОВЫ Ў ЛЮБЫ МОМАНТ, ПА ПЕРШАМУ ЗАКЛІКУ ПАРТЫІ І УРАДА ВЫЛЕЦЕЦЬ НА БАЯВЫМ САМАЛЕЦЕ НА АБАРОНУ СОВЕЦКІХ ГРАНІЦ.

ПАЛІНА ОСІПЕНКА, ВЕРА ЛАМАКА, МАРЫНА РАСКОВА.

З АРХАНГЕЛЬСКА. 2 ліпеня 1938 г. **Масква, Крэмль**

Іосіфу Вісарыёнавічу СТАЛІНУ

БЕСПАСАДАЧНЫ ПЕРАЛЕТ СЕВАСТОПАЛЬ — АРХАНГЕЛЬСК ВЫКАНАН. ГАТОВЫ ВЫКАНАЦЬ ЛЮБОЕ ВАША ЗАДАННЕ.

ОСІПЕНКА, ЛАМАКА, РАСКОВА.

З АРХАНГЕЛЬСКА, 2 ліпеня 1938 г. **Масква, Крэмль**

Таварышам Сталіну, Молатаву, Варашылаву, Калініну, Кагановічу, Ежову

З РАДАСЦЮ ПАВЕДАМЛЯЕМ АБ ВЫКАНАННІ ВАШАГА ЗАДАННЯ — БЕСПАСАДАЧНАГА ПЕРАЛЁТУ СЕВАСТОПАЛЬ—АРХАНГЕЛЬСК. ГАТОВЫ ВЫКАНАЦЬ ЛЮБОЕ ЗАДАННЕ ПАРТЫІ, УРАДА.

ОСІПЕНКА, ЛАМАКА, РАСКОВА.

АРХАНГЕЛЬСК

Старшым лейтэнантам тт. Осіпенка, Ламака і лейтэнанту т. Раскавай

ГОРАЧА ВІТАЕМ СЛАЎНЫХ ЛЕТЧЫЦ тт. **ПАЛІНУ ОСІПЕНКА, ВЕРУ ЛАМАКА І МАРЫНУ РАСКОВУ** З ПАСПЯХОВЫМ ВЫКАНАННЕМ БЕСПАСАДАЧНАГА ПЕРАЛЕТУ НА ГІДРАСАМАЛЕЦЕ ПА МАРШРУТУ СЕВАСТОПАЛЬ — АРХАНГЕЛЬСК.

ГАНАРЫМСЯ МУЖНАСЦЮ, ВЫТРЫМКАЙ І ВЫСОКІМ МАЙСТЭРСТВАМ СОВЕЦКІХ ЖАНЧЫН-ЛЕТЧЫЦ, УПІСАЎШЫХ СВІМ БЛІСКУЧЫМ ПЕРАЛЕТАМ ЯШЧЭ АДЗІН РЭКОРД У ГІСТОРЫЮ СОВЕЦКАЙ АВІЯЦЫІ.

МОЦНА ПАЦІСКАЕМ ВАШЫ РУКІ.

І. СТАЛІН
В. МОЛАТАЎ
К. ВАРАШЫЛАЎ
М. КАЛІНІН
Л КАГАНОВІЧ.
Н. ЕЖОЎ.



Лётчыца ордэнаносец П. Д. ОСІПЕНКО. (СФ).

СЛАВА ГЕРОЯМ СОВЕЦКАЙ АВІЯЦЫІ!

Які велічны час перажываюць народы Совецкага Саюза! Кожны новы дзень прыносіць новыя поспехі, выдатныя перамогі соцыялістычнага будаўніцтва, здзіўляючыя, захапляючыя. Грыміць па ўсяму свету слава пра гераічны совецкі народ, пра адважных і бясстрашных яго сыноў, выхаванцаў самага мудрага, самага мужнага, самага вялікага бацькі і правадыра — таварыша Сталіна.

Слава ідзе па ўсёй зямлі пра совецкую авіяцыю, пра бяспрыкладную мужнасць і геройства совецкіх лётчыкаў і лётчыц. У залатой кнізе сусветных дасягненняў па авіяцыйных рэкордах на самых слаўных старонках запісаны імёны герояў — сыноў соцыялістычнай радзімы. Міжнародная Авіяцыйная федэрацыя не паспявае рэгістраваць дасягненні совецкай авіяцыі.

Яшчэ зусім нядаўна, на 38 канферэнцыі ФАІ гордым сокалам Героям Совецкага Саюза Громаву, Юмашэву, Даніліну, якія з Масквы праз Паўночны полюс без пасадкі пераляцелі ў Амерыку аж да горада Сан-Дзіего, недалёка ад Мексікі, уручаны ганаровыя медалі. Совецкі Саюз, па праву, ганарыцца сваімі лётчыкамі, сваёй уласнай авіяцыйнай тэхнікай, лётчыкамі і лётчыцамі, выхаванымі народам-героем, вялікім правадыром — таварышом Сталіным.

У дні ўсенароднага лікавання, у дні выбараў Вярхоўных Советаў саюзных і аўтаномных рэспублік, у дні бліскучай перамогі непахіснага сталінскага блока комуністаў і беспартыйных на выбарах радыё і газеты прынеслі новыя радасныя весткі пра людзей авіяцыі.

Владзімір Кокінакі, які карыстаецца заслужанай павагаю, як адзін з лепшых лётчыкаў, разам са сваім штурманам Брандзінскім, выдатным майстрам авіяцыйнай справы, за 24 гадзіны з мінутамі без пасадкі пакрылі адлегласць 7.600 кілометраў. Стартаваўшы з Масквы, яны бліскуча зрабілі пасадку ў раёне Хабараўска. Гэты шлях праходзіў у цяжкіх атмасферных умовах, над тайгою, над горамі. Непахісная воля да перамогі, мужнасць, адвага і бясстрашнасць, якую любоўна прывіў совецкім лётчыкам, совецкаму народу таварыш Сталін — перамаглі. Для нашых лётчыкаў, для сталінскай авіяцыі немагчымага няма.

І калі народ соцыялістычнай радзімы, вялікі Сталін з захапленнем віталі гераічных лётчыкаў, праляцеўшых без пасадкі па новай трасе Масква—раён Хабараўска, упісаўшых новую бліскучую старонку ў героіку совецкай авіяцыі, ад Чорнага мора ледзь на світанне ўзняўся ў паветры гідраплан «МП-1» і ўзяў курс на Белае мора.

Гэта Паліна Осіпенка, Вера Ламака — ваенныя лётчыцы, выдатна асвоіўшыя авіятэхніку і працуючыя ў знішчальнай і іншай авіяцыі з Марынай Расковай — вучаніцай героя Совецкага Саюза тав. Белякова — выдатным штурманам вылецелі ў беспасадачны маршрут Севастопаль—Архангельск.

Праз 10 гадзін 33 мінуты самалёт «МП-1», пілатыруемы ваеннымі лётчыцамі, зрабіў пасадку на Холмаўскім возеры, прайшоўшы шлях адлегласцю ў 2.416 кілометраў.

Пералёт тт. Осіпенка, Ламака і Расковай, якія праклалі паветраны шлях ад Чорнага мора да Белага, з'яўляецца выдатным дасягненнем. Ен сведчыць пра высокую авіяцыйную культуру, высокую якасць совецкіх самалётаў. Ен выдатны не толькі таму, што зроблен жанчынамі, а і таму, што з'яўляецца прыкладам мужнасці і адвагі совецкіх жанчын, совецкіх пілотаў, якія памнажаюць магутнасць і славу вялікай соцыялістычнай дзяржавы.

Выключна выдатныя поспехі совецкай авіяцыі, новыя гераічныя перамогі тт. Кокінакі, Брандзінскага, лётчыц тт. Осіпенка, Ламака і Расковай — бліскучае сведчанне поспеху абароннай магутнасці Совецкага Саюза. Яны выклікаюць у сэрцы народаў соцыялістычнай радзімы радасць і жаданне ўсімі сіламі і сродкамі мацаваць магутнасць сваёй бацькаўшчыны, зрабіць Совецкі Саюз непрыступнаю крэпасцю для ўсякага ворага.

Таварыш Сталін і яго баявыя саратнікі тт. В. Молатаў, К. Варашылаў, М. Калінін, Л. Кагановіч, Н. Ежоў накіравалі ў Архангельск старшым лейтэнантам тт. Осіпенка, Ламака і лейтэнанту т. Расковай прывітальную тэлеграму:

«Горача вітаем слаўных лётчыц тт. Паліну Осіпенка, Веру Ламака і Марыну Раскову з паспяховым выкананнем беспасадачнага пералёту на гідрасамалёце Севастопаль—Архангельск.

Ганарымся мужнасцю, вытрыманасцю і высокім майстэрствам совецкіх жанчын-лётчыц, упісаўшых сваім бліскучым пералётам яшчэ адзін рэкорд у гісторыю совецкай авіяцыі.

Моцна ціснем вашыя рукі».

Атрымаць такую пахвалу, такое прывітанне ад таварыша Сталіна і яго бліжэйшых саратнікаў — найвялікшая радасць і шчасце кожнага патрыёта соцыялістычнай радзімы. І совецкія лётчыцы — верныя патрыёткі соцыялістычнай радзімы — адказалі:

«Гатовы выканаць любое заданне партыі, урада»,

Гэты адказ просты і кароткі, адказ, які выказвае сабою ўсе пачуцці і жаданні ўсяго шматмільённага совецкага народа, совецкіх патрыётаў і патрыётак, грамадзян краіны соцыялізма.

Беларускі народ ганарыцца адважнымі лётчыцамі, упісаўшымі новую слаўную старонку ў гісторыю совецкай авіяцыі. Работнікі совецкай беларускай літаратуры і мастацтва шлюць гарачае прывітанне храбрым, слаўным выхаванкам соцыялістычнай радзімы, вялікага правадыра народаў таварыша Сталіна — лётчыцам тт. Осіпенка, Ламака і Расковай!

Слава героям сталінскай авіяцыі! Слава натхніцелю на бліскучыя подвігі, правадыру, настаўніку і другу — мудраму таварышу Сталіну!





Лётчык ордэнаносец, дэпутат Вярхоўнага Савета СССР В. К. Кокінакі і штурман А. М. Брандзінскі, якія зрабілі беспасадачны пералёт Масква — раён Хабараўска.

НА ЗДЫМКУ: справа налева: В. К. Кокінакі і А. М. Брандзінскі.

ПАДПІСКАЙ НА ПАЗЫКУ ТРЭЦЯЙ СТАЛІНСКАЙ ПЯЦІГОДКІ ПАВЯЛІЧЫМ БАГАЦЦІ СОЦЫЯЛІСТЫЧНАЙ КРАІНЫ!

АБ ВЫПУСКУ ДЗЯРЖАЎНАЙ ПАЗЫКІ ТРЭЦЯЙ ПЯЦІГОДКІ

(Выпуск першага года)

ПАСТАНОВА СОВЕТА НАРОДНЫХ КАМІСАРАЎ САЮЗА ССР

У мэтах прыцягнення растучых зберажэнняў насельніцтва на ажыццяўленне задач гаспадарча-культурнага будаўніцтва трэцяга пяцігадовага плана і на патрэбы далейшага ўмацавання абароны краіны, Совет Народных Камісараў СССР, у адпаведнасці з шматлікімі пажаданнямі працоўных, пастанаўляе:

1. Выпусціць Дзяржаўную Пазыку Трэцяй Пяцігодкі (выпуск першага года) на суму 5 мільярдаў рублёў.

2. Пазыку выпусціць тэрмінам на 20 год—з 1 снежня 1938 года па 1 снежня 1958 года, з 4-х процантаў гадавых.

3. Аблігацыі пазыкі і даходы ад іх, у тым ліку выйгрышы, аслабаніць ад абкладання дзяржаўнымі і мясцовымі падаткамі і зборамі.

4. Зацвердзіць прадастаўленыя Народным Камісарыятам фінансаў СССР умовы выпуску Дзяржаўнай Пазыкі Трэцяй Пяцігодкі (выпуск першага года).

Старшыня Совета Народных Камісараў Саюза ССР В. МОЛАТАЎ.

Кіраўнік справамі СНК Саюза ССР Н. ПЕТРУНІЧЭЎ.

Масква, Крэмль.

1 ліпеня, 1938 г.

———о———

ХРОНІКА ПАДПІСКІ

ДНЕПРАПЕТРОЎСК. **(Па тэлеграфу).** На 3 ліпеня падпіска на пазыку па Белдзяржрдрамтэатру дасягнула 42.000 рублёў пры месячным фондзе зарплаты ў 47.000. Падпісаліся ўсе 115 чалавек.

РАМАНОВІЧ, ГАЙДАРЫН.

***

МАГІЛЁЎ. **2 ліпеня, 10 гадзін вечара. (Па тэлеграфу).** Калектыў музычальнага вучылішча ў складзе 38 чалавек падпісаўся на 11.365 рублёў, што складае каля 86 процантаў месячнага фонда зарплаты. Падпіска прадаўжаецца.

***

РАГАЧОЎ. **(Па тэлеграфу).** Усе 29 работнікаў калгасна-саўгаснага тэатра падпісаліся на пазыку. Сума падпіскі — 7.835 рублёў, што складае 91,6 процантаў месячнага фонда зарплаты.

Старшыня мясцкома МАЗУРЭНКА.

***

ВІЦЕБСК. **(Па тэлеграфу).** Увесь тэхнічны персанал Віцебскага гарадского тэатра падпісаўся на пазыку. Сума падпіскі — 3.550 рублёў пры месячным фондзе зарплаты 3.700 рублёў.

***

МАЗЫР. **(Па тэлеграфу).** Абласны саўгасна-калгасны тэатр у ліку 28 чалавек закончыў падпіску на пазыку. Ахоплены ўсе працаўнікі. Сума падпіскі — 9.090 рублёў — 100 процантаў месячнага фонда зарплаты.

Старшыня мясцкома ДАНІЛЬЧЫК.

***

БАБРУЙСК. **2 ліпеня. (Па тэлеграфу).** Калгасна-саўгасны тэатр разгарнуў падпіску на пазыку. З 27 чалавек пакуль-што падпісаліся 24. Сума падпіскі — 6.840 рублёў, пры фондзе зарплаты ў 8.780 рублёў.

***

ОРША. **(Па тэлеграфу).** Усе трынаццаць чалавек абслугоўваючага персанала Аршанскага гарадскога тэатра падпісаліся на 2.725 рублёў, што складае 100 процантаў месячнага фонда зарплаты.

***

МЕНСК. З 134 работнікаў Белрадыёкамітэта на 3 ліпеня падпісаліся на пазыку 124 чалавекі. Сума падпіскі — 43.740 рублёў, пры месячным фондзе зарплаты 49.320 рублёў.

***

МЕНСК. Калектыў Белдзяржвыдавецтва ў складзе 130 чалавек падпісаўся на 43.390 рублёў, што складае 88 процантаў месячнага фонда зарплаты. Падпіска была ў асноўным праведзена на працягу аднаго дня. З 18 адпачываючых і камандыровачных 8 прыслалі тэлеграмы і паведамленні з просьбаю падпісацца на пазыку.

———о———

Падпіскай на пазыку ўзмоцнім абароназдольнасць нашай краіны

2 ліпеня адбыўся мітынг пісьменнікаў, паэтаў і работнікаў праўлення Саюза совецкіх пісьменнікаў БССР, прысвечаны выпуску Дзяржаўнай Пазыкі Трэцяй Пяцігодкі (выпуск першага года).

Выступіўшыя тт. М. Лынькоў, Стаховіч, Бутэлін, Мазо, Варашылаў, Агняцвет горача віталі пастанову ўрада БССР. Таварышы адзначылі велізарнае палітычнае значэнне дзяржаўнай пазыкі і заклікалі пісьменнікаў падпісацца на яе, тым самым дапамагчы сваёй радзіме пабудаваць новыя фабрыкі і заводы, яшчэ больш узмацніць абароназдольнасць нашай краіны.

Адразу пасля мітынга пачалася падпіска. За тры гадзіны сума падпіскі дасягнула каля 20.000 рублёў. Многія таварышы падпісаліся на 100—125 процантаў свайго месячнага заработку.

Усяго падпісаліся 82 чалавекі на 35.730 рублёў, што складае 96 процантаў месячнага фонда зарплаты. Падпіска прадаўжаецца.

МАЗО.



Падпіска на Пазыку першага года трэцяй сталінскай пяцігодкі сярод камбайнераў Першай Менскай МТС. Падпісваецца на пазыку камбайнерка-стаханаўка т. Н. ЖЫДОВІЧ.

ЗАЦЯГВАЮЦЬ ПАДПІСКУ НА ПАЗЫКУ ТРЭЦЯЙ ПЯЦІГОДКІ

Палітычнае і эканамічнае значэнні совецкіх пазык разумее кожны рабочы, кожны калгаснік, кожны прадстаўнік нашай совецкай працоўнай інтэлігенцыі. Лепшым доказам служыць вялікі ўздым, энтузіязм і радасць, якія выклікала пастанова ўрада аб выпуску Пазыкі Трэцяй Пяцігодкі (выпуск першага года). У многіх калектывах падпіска на пазыку была праведзена літаральна на працягу некалькіх гадзін. У пераважнай колькасці калектываў падпіска дасягае 90—100 процантаў месячнага фонда заработнай платы. Працоўныя совецкай краіны з радасцю пазычаюць соцыялістычнай дзяржаве свае зберажэнні, добра ведаючы, што гэтыя грошы пойдуць на далейшае паляпшэнне добрабыту працоўных, на далейшае соцыялістычнае будаўніцтва, на ўмацаванне абароназдольнасці нашай любімай радзімы.

Нажаль, знаходзяцца яшчэ кіраўнікі, якія не разумеюць вялікага значэння хуткага і поўнага ахопу падпіскай на новую пазыку. Да іх адносіцца ў першую чаргу кіраўніцтва Тэатра оперы і балета. Даволі сказаць, што на 4 ліпеня, падпіска па калектыву тэатра дасягнула 36.900 рублёў, пры месячным фондзе зарплаты ў 206 тысяч рублёў. З 380 чалавек падпісаліся на пазыку пакуль што 89 чалавек.

Кіраўнік тэатра тав. Ярыкаў тлумачыць гэтае становішча тым, што калектыў тэатра знаходзіцца ў адпачынку і таму цяжка арганізаваць падпіску.

Аднак, справа ў тым, што ніякай **арганізацыі** падпіскі ў тэатры няма. **Няма** нават адказнай асобы за падпіску на пазыку. Падпіску праводзіць кіраўнік справамі тав. Кастроў. Яго спроба прыцягнуць да гэтай справы намесніка старшыні мясцкома тав. Фейгензона, які знаходзіцца ў Менску, закончылася нічым. Тав. Фейгензон не толькі адмовіўся заняцца арганізацыяй падпіскі, але каб падаць «прыклад», сам падпісаўся на суму, якая складае значна менш паловы яго месячнага заработку. І сапраўды, многія ўзялі з яго «прыклад». Зразумела, падпіска на пазыку — справа зусім добраахвотная, але ўсё-ж паводзіны актыва, тым больш намесніка старшыні мясцкома, вельмі многа значаць.

Паводле слоў тав. Ярыкава, усе адрасы адпачываючых у дырэкцыі ёсць і ўсім адпачываючым быццам пасланы лісты аб пазыцы. Паводле-ж слоў кіраўніка справамі, выходзіць, што многіх адрасоў у дырэкцыі няма і што лістоў паслана ўсяго 60. Калі да гэтай лічбы дадаць лік падпісаўшыхся (89 чалавек), то атрымаецца, што арганізацыя падпіскі ахапіла толькі 149 чалавек (з 380). Ясна, што такая «арганізацыя» справы пагражае калі не правалам падпіскі ў тэатры, то значнай яе адцяжкай.

Але самае асноўнае, што ні кіраўнік тэатра тав. Ярыкаў, ні сакратар парткома тав. Шмакаў не вырашылі яшчэ, што прадпрыняць для фарсіравання падпіскі. Парада кіраўніка спраў паслаць каго-небудзь у інтэрнат артыстаў, **які знаходзіцца ў Менску,** павіснула ў паветры. Другая парада — паслаць адпачываючым артыстам (дарэчы, яны адпачываюць **групамі па 10—20 чалавек на адным курорце**) тэлеграмы—выклікала супярэчанне Ярыкава і заўвагу аб тым, што ў яго няма грошай на тэлеграфныя выдаткі.

Так адносіцца да падпіскі на пазыку могуць толькі палітычныя сляпцы.

П.

ПАДПІСКА ПРАХОДЗІЦЬ З ВЯЛІКІМ УЗДЫМАМ

З вялікім уздымам праходзіць падпіска на пазыку ў калектыве Дзяржаўнай філармоніі БССР. Раніцою 2 ліпеня, як толькі былі атрыманы газеты з пастановаю Соўнаркома Саюза ССР аб выпуску Пазыкі Трэцяй Пяцігодкі (выпуск першага года), быў скліканы мітынг. Пасля інфармацыі старшыні мясцкома тав. Салабуціна аб пазыцы і выступленняў актывістаў пачалася падпіска.

Не гледзячы на тое, што асноўныя калектывы філармоніі знаходзяцца ў гастрольных паездках, да канца наступнага дня (3 ліпеня) падпіска на пазыку была ў асноўным закончана. Калектыў ансамбля песні і танца, які гастраліруе зараз у Віцебску, прыслаў тэлеграму, у якой з радасцю паведамляе, што падпіскай ахоплены ўсе 100 процантаў працуючых на суму 12.100 рублёў, што складае звыш 90 процантаў месячнага фонда заработнай платы. Тэлеграма ад калектыва хора, які знаходзіцца зараз у Шклове, паведамляе, што на пазыку падпісаўся ўвесь калектыў на 15.750 рублёў, што складае звыш 88 процантаў месячнага фонда зарплаты. Чакаецца паведамленне сімфанічнага аркестра, які гастраліруе зараз у Жалезнаводску.

Вынікі падпіскі на 4 ліпеня (без сімфанічнага аркестра) складаюць 47.325 рублёў — каля 90 процантаў месячнага фонда зарплаты падпісаўшыхся.

СОВЕЦКІЯ ПАЗЫКІ ВЫГАДНЫ ПАЗЫКАТРЫМАЛЬНІКУ

Хутка запоўніліся падпісныя лісты ва Упраўленні па справах мастацтваў пры СНК БССР. Падпіска на пазыку была ў асноўным закончана на працягу аднаго дня. Усе 25 работнікаў Упраўлення падпісаліся на 13.000 рублёў, што складае 96,5 процантаў месячнага фонда заработнай платы.

У 9 гадзін раніцы 2 ліпеня мясцком атрымаў дзве тэлеграмы — ад аднаго камандзіровачнага і аднаго адпачываючага — з просьбаю падпісаць іх на пазыку. Рэдкалегія насценгазеты выпусціла ў той-жа дзень экстраны бюлетэнь аб падпісцы на пазыку.

Сярод падпісчыкаў новай пазыкі — рад таварышаў, якія за апошні час атрымалі буйныя выйгрышы па совецкіх пазыках. Так работнік Упраўлення тав. Бойген выйграў у 1936 годзе па дзяржаўнай пазыцы 1935 года 5.000 рублёў, тав. Лапідус выйграў за апошняе паўгоддзе 450 рублёў, тав. Балоціна — 375 рублёў і т. д.

Адзначаючы выгаднасць совецкіх пазык для пазыкатрымальнікаў тт. Бойген, Лапідус, Балоціна падпісаліся на аблігацыі новай пазыкі на сумы сваіх месячных акладаў і заклікалі ўвесь калектыў узяць з іх прыклад.

Канчатковыя вынікі падпіскі наступныя: 46 работнікаў Упраўлення па справах мастацтваў, Дома народнай творчасці і тэатральнага вучылішча падпісаліся на 20.900 рублёў, што складае 94,6 процантаў месячнага фонду зарплаты.



НА ЗДЫМКУ: артысткі калмыцкага аркестра народных інструментаў Цеген Дорджыева (злева) і Джыргл Корваева на гастролях у рыбакоў Паўночнага Каспія. (Саюзфото).

„БАРЫС ГАДУНОЎ" НА БЕЛАРУСКАЙ МОВЕ

Адзін з самых драматычных момантаў гісторыі рускага народа пакладзен у аснову геніяльнай трагедыі «Барыс Гадуноў». Над гэтай трагедыяй Пушкін працаваў шмат, з вялікай любоўю і быў захоплены вынікамі сваёй працы. Творчай вышыні, вялікай мужнасці і размаху дасягнуў геній паэта ў гэтым творы, які праз цэлае стагоддзе ўвайшоў у нашу эпоху такім жывым і хвалюючым. Нас здзіўляе сіла майстэрства і разам з тым велічная прастата, з якой вылеплены скульптурна-адчувальныя, складаныя і супярэчлівыя вобразы людзей, праз узаемадачыненні, думкі і пачуцці, праз спадзяванні і страсці якіх раскрываецца і ўваскрашаецца перад намі цэлая эпоха.

Пераклад гэтага пушкінскага твора на беларускую мову трэба толькі вітаць.

Мы маем пераклад «Барыса Гадунова», зроблены паэтам П. Глебкам.

Як-жа справіўся Глебка з перакладам, у якой ступені яму ўдалося перадаць паэтычную культуру Пушкіна, як перадаў ён на беларускай мове гучанне трагедыі, унутраны яе пафас, высокую страсць і эмацыянальную напружанасць, багацце пушкінскай мовы?

Ацэньваючы якасць перакладу кожнага паэтычнага твора, трэба мець на ўвазе натхнёнасць, культуру і стыль перакладу, ступень яго мастацкай блізкасці да арыгіналу. Трэба сказаць, што, не гледзячы на істотнейшыя заганы ў перакладзе, Глебка паставіўся сур'ёзна да работы. Ёсць нямала месц, перакладзеных натхнёна, з пачуццём, з мастацкім густам, дзе не зніжаецца высокае гучанне пушкінскага слова. Напрыклад, няпрэнна перакладзен маналог Барыса Гадунова «Дасяг я ўлады поўнай». Але перакладчык не заўсёды трымаецца на патрэбнай вышыні. Пераклад трагедыі няроўны, зроблены не ўсюды з аднолькавай сілай.

Глебка ў сваёй працы стараўся трымацца прынцыпу — быць як мага больш дакладным у перакладзе, не адыходзіць ад пушкінскага тэкста. У гэтым ёсць і дадатнае, і адмоўнае. Нам здаецца, што Глебка, імкнучыся часта рабіць, бадай, даслоўны пераклад, што амаль немагчыма пры перакладзе паэтычнага твора, баючыся адступіць ад арыгіналу, у значнай ступені абмежаваў, звузіў свае магчымасці. Такія адступленні неабходны, іх унікнуць нельга, і таму не трэба іх баяцца, трэба толькі захоўваць меру паэтычнага адчування.

Няроўнасць перакладу лёгка заўважыць. Пры першым параўнанні перакладу трагедыі з яе арыгіналам заўважаеш такія заганы, як эмацыянальныя спады, зніжэнне ўнутранай напружанасці слова-вобраза, а праз гэта і зніжэнне пафасу перажыванняў герояў трагедыі. Празаічнасць — вось што часта адчуваецца ў перакладзе. Глебка не заўсёды з аднолькавай увагай ставіўся да максімальна поўнай передачы драматычна-эмацыянальных асаблівасцей трагедыі. Пэўная рацыяналістычнасць характарызуе ў некаторай ступені стыль перакладу.

Галоўная прычына гэтага крыецца ў моўных сродках перакладу. Пушкінскае слоўнае майстэрства, багацце яго мовы часта не знаходзяць адэкватнага сабе выражэння. Праўда, своеасаблівую моўную спецыфіку трагедыі, якую ў значнай ступені складаюць славянізмы, перадаць на беларускай мове амаль немагчыма. Каб захаваць рытм, Глебка часамі ідзе на зніжэнне слоўнага вобраза, апускаючы эпітэты, робіць больш празаічнымі метафары, што звужвае эмацыянальнае раскрыццё з'явы. Напрыклад, з боку мастацкага будзе неаднолькава сказаць замест «на моего коварного злодея» — «на нашага супольнага злачынца», альбо замест «кажу врагам заветную дорогу» — проста «я ворагам паказваю дарогу», ці замест «душа твоя должна пылать весельем» — «душа твая павінна быць вясёлай».

Як ужо адзначалася, галоўная слабасць перакладу, месціцца ў празаічнай передачы ці то асобных слоў-вобразаў, ці то цэлых радкоў. Возьмем хоць-бы сцэну ў келлі Чудава манастыра, альбо размову цара з Феодарам. Побач з трапнай перадачай зместу, захаваннем пушкінскай чаканнасці фразы, вобраза, тут ёсць занадта празаічныя месцы. У перакладзе чытаем:

Вось гэтак дзяк судовы абыяка
Глядзіць на ўсіх і вінных і нявінных.

Тут няма вобраза, тады як у Пушкіна ён створаны адным мазком:

Так точно дьяк, в приказах поседелый,
Спокойно зрит на правых и виновных.

Расказваючы пра мінулае, Пімен кажа Грыгорыю:

Царь Иоан искал успокоенья
В подобии монашеских трудов.
Его дворец, любимцев гордых полный,
Монастыря вид новый принимал...

Перакладзена:

Цар Іоан шукаў заспакаення
У дзейнасці, падобнай да манашскай,
Яго дварэц, — любімцаў гордых поўны,
Падобны быў на новы манастыр...

Тут моўная абмежаванасць, што прывяло да блекласці і страты мастацкай выразнасці радка. Не менш слаба перакладзена: «Борис, Борис! **всё пред тобой трепещет**» — «Барыс, Барыс! **усе цябе баяцца**». Тут розніца ў ступені пачуцця, якое выражаюць словы «трепещет» і «баяцца». Падобным перакладам з'ўляецца і наступны: «Возвысить глас измена не дерзала» — «**Узвысіць тон** не важылася здрада».

Празаічнасць перакладу з'ўляецца то ў выніку недастатковага багацця мастацкага слоўніка перакладчыка, то ў выніку эмацыянальнай неадпаведнасці ў канструкцыі паэтычнай фразы. Падамо некалькі прыкладаў, дзе, як нам здаецца, гэта дае надзвычай сябе адчуваць. У Пушкіна Самазванец гаворыць:

Я знаю дух народа моего;
В нем набожность не знает исступленья...

Перакладзена:

Я ведаю майго народу дух;
Ён, верачым, за крайне перахodзіць...

Сэнс не парушан, а паэтычная фраза страчана. Пра Курбскага той-жа Самазванец гаворыць:

Великий ум! Муж битвы и совета!
Но с той поры, когда являлся он,
Своих обид ожесточенный мститель..

Перакладзена:

Вялікім быў і ў бітвах і ў парадах!
Ды з тых часоў, калі з'яўляўся ён
Адпомсціцца за крыўды свае люта...

І тут сэнс не парушан, але паэтычная фраза стала занадта звычайнай. Герой трагедыі, баярын Пушкін, выступаючы перад народам, гаворыць:

Опалу, казнь, бесчестие, налоги,
И труд, и глад—все испытали вы.

Перакладзена:

Вы зведалі падаткі, кару, ганьбу,
І голаду, і працы паспыталі.

Тут няма пушкінскай сілы, акорднага гучання заключнай часткі фразы. У даным выпадку нельга было перакладаць «испытали» на «паспыталі». Тут павінна было стаць мацнейшае слова і тады не атрымалася-б спакойнага апавядання замест палкай прамовы аратара, які заклікае народ. Такім-жа з'яўляецца і пераклад пушкінскага **«не род, а ум поставлю в воеводы»** на **«начальнікам не род, а розум будзе»**.

Сцэна сустрэчы Самазванца з Марынай займае асаблівае месца ў трагедыі, яна пададзена ў плане вялікай драматычнасці. Гэта сцэна перададзена на беларускай мове, бадай, найслабей ва ўсёй трагедыі. У перакладчыка тут часам нават траціцца так патрэбная тонкасць мастацкага адчування. Вось Самазванец чакае спаткання з Марынай. Яго хваляванне Пушкін передае так:

За мной гнались—я духом не смутился
И дерзостью неволи избежал.
Но что-ж теперь теснит мое дыханье?
Что значит сей неодолимый трепет?
Иль это дрожь желаний напряженных?
Нет — это страх...

Увага чытача прыкавана да перажываемага героем пачуцця, якое называецца і акцэнтуецца толькі ў самым канцы паэтычнага ўрыўка, чаго патрабуе яго эмацыянальная напружанасць. Пераклад гэтага месца чытаецца так:

За мною гналіся — я не збаяўся
І смеласцю няволю абмінаў.
А што-ж цяпер мае сціскае грудзі?
Што значыць страх непераможны гэты?
Ці гэта дрож напружаных жаданняў?
Не — гэта страх.

У перакладзе апошні радок паўтарае чацверты, паўтарае ўжо сказанае, тады як у Пушкіна мы маем эмацыянальнае раскрыццё перажываемага пачуцця, якое называецца толькі ў канцы, эмацыянальна закрываючы паэтычны перыяд.

Я не прыхільнік рабскага следвання перакладчыка за тэкстам твора. Такім шляхам мастацкага перакладу зрабіць нельга. Перакладчык мусіць рабіць змены, калі яны вымагаюцца патрабаваннямі спецыфікі яго мовы, але пры гэтым ён абавязан імкнуцца найбольш паўней захаваць унутраную асаблівасць паэтычнага вобраза, каб ён не стаў толькі далёкім падабенствам арыгіналу.

Шырокавядома такое месца з трагедыі:

Тень Грозного меня усыновила,
Димитрием из гроба нарекла,
Вокруг меня народы возмутила
И в жертву мне Бориса обрекла —
Царевич я.

Перакладзена:

Здань Грознага мяне пасынавіла,
З труны імя Дзімітрыя дала,
У афяру мне Барыса асудзіла,
Вакол мяне народы узняла —
Царэвіч я.

Такой перастаноўкі трэцяга і чацвертага радкоў, якую зрабіў Глебка выключна для рыфмы, рабіць нельга было з меркаванняў перадачы паступовага нарастання пафасу, яго ўнутранай логікі. Такая перастаноўка радкоў, пропуск «і», якое тут мае эмацыянальна-акцэнтуючае значэнне, прывялі да эмацыянальнага зніжэння зместу, што з'яўляецца адмоўным з пункту гледжання мастацкасці перакладу.

Праўда, рэдка, але ёсць выпадкі няўважлівых, проста кажучы, адносін перакладчыка да звычайнага сэнсу слова. Напрыклад: «Ему Москву **уступит** сын Борисов» перакладзена—«Яму Маскву **адступіць** сын Барысаў». А чаму-б не сказаць «уступіць»? Адступіць можна, напрыклад, з поля бойкі, ці, скажам, набытую рэч і т. п. Словы «Благословится подвиг, его-ж они прославили **заране**» перакладзены—«Благаславіцца подвіг, які яны праславілі **заўчасна**». Недарэчна, бо «заўчасна» азначае не ў свой час, «преждевременно», а гэта зусім не тое, што «заране».

А вось некалькі прыкладаў непатрэбных перакладаў, калі можна так сказаць: «цар занемог»—«цар захварэў», «мало.... уцелело» — «мала... засталося», «наглый самозванец»—«дзёрскі самазванец», «гостей... иноплеменных» — «гасцей... чужаземных», «храбрых атаманов»—«смелых атаманаў», «схватки боевы» — «бітвы баявыя». Усе гэтыя словы «занямог», «уцалела», «наглы», «іншапляменных», «храбрых», «схваткі» ўжываюцца ў народнай мове, яны супольныя для рускай і беларускай моваў і перакладаць іх, правільней, замяняць іншымі, калі гэта не вымагаецца патрабаваннямі рытму альбо рыфмы, зусім непатрэбна. Сюды можна аднесці і штучны пераклад слова «сжалиться» на «зглянецца».

Недахопаў, якія мною адзначаны, можна было-б пазбавіцца, больш старанна адпліфаваўшы пераклад, што падняло-б культуру яго. Але, гаворачы пра недахопы, я ні ў якім разе не хачу сказаць, што ўвесь пераклад трагедыі зроблен дрэнна. Я адзначаў толькі асобныя слабыя месцы, якіх магло-б не быць.

Прайшло стагоддзе, як Нікалай I вакатаваў вялікага паэта, помсцячы яму за гордае нежаданне ўсхваляць часы змрочнага і нікчэмнага самаўладства. Прайшло цэлае стагоддзе, але мы, сучаснікі вялікіх соцыяльных перабудоў, яшчэ і сёння так прагна п'ем з крыніц свабодалюбівай высокай пушкінскай паэзіі, паэзіі невычарпальных глыбінь чалавечага духу, адчуваючы ўсю слодыч яе жыватворчай сілы. Беларускі народ, як і ўсе народы Совецкага Саюза, горача любіць і паважае вялікага паэта вялікага рускага народа. Гэта патрабуе ад кожнага перакладчыка твораў Пушкіна ўсімі сіламі імкнуцца як мага паўней данесці да чытача створанае вялікім геніем—у яго чаруючым харастве, велічнасці і натхнёнай прастаце, у яго сапраўднай і непаўторнай мастацкай сіле.

І. ПЛАШЧЫНСКІ.

ПАРТЫЙНАЕ ЖЫЦЦЁ

ВЫКАРЧАВАЦЬ РЭШТКІ ШКОДНІЦТВА У ТЭАТРЫ ОПЕРЫ і БАЛЕТА

Партыйная арганізацыя Тэатра оперы і балета налічвае 16 комуністаў. Есць у тэатры і комсамольская арганізацыя з 25 чалавек. Гэтая досыць буйная партыйна-комсамольская арганізацыя павінна была-б па-бальшэвіцку ўзначаліць барацьбу за ліквідацыю вынікаў шкодніцтва ў тэатры і перабудаваць партыйную і палітыка-масавую работу ў адпаведнасці з пастановамі лютаўска-сакавіцкага (1937 г.) і студзеньскага (1938 г.) пленумаў ЦК ВКП(б).

Аднак, баявой, сапраўды бальшэвіцкай работы партыйна-комсамольскай арганізацыі тэатра ў гэтым напрамку яшчэ няма. Партком (новы сакратар т. Шмакаў) па сутнасці яшчэ нават не прыступіў да выканання пастаноў справаздачна-перавыбарчага сходу, які адбыўся ў маі.

Важнейшая палітычная задача тэатра — своечасовая і высокаякасная падрыхтоўка да дэкады беларускага мастацтва ў Маскве, якая намечана на вясну 1939 года. Але тав. Шмакаў сцвярджае, што пры цяперашніх тэмпах работы дэкада можа быць падрыхтавана не раней снежня 1939 года. Паводле запэўнівання начальніка Упраўлення па справах мастацтваў тав. Патапейка, рэпетыцыйныя памяшканні ў новым будынку павінны быць здадзены не пазней 1 ліпеня. Як і заўсёды бывае ў цяперашніх незадачлівых кіраўнікоў Упраўлення тт. Патапейка і Рубінштэйна — словы разыходзяцца са справамі. Памяшканне не толькі не гатова ў тэрмін, але і невядома калі яно будзе прадастаўлена тэатру. Работа тэатра пад пагрозай зрыву.

У план дэкады ўключаны тры оперы: «Міхась Падгорны», «Дрыгва», «Пагранічнікі» і балет «Салавей». Опера «Міхась Падгорны», якая павінна быць па плану выпушчана 1 лістапада, яшчэ не мае рэжысёра. Есць меркаванні, што 1 жніўня пачне працаваць рэжысёр Баратаў, але ўпэўненасці ў гэтым у кіраўнікоў тэатра няма. Не ўсе оперныя партыі забяспечны спевакамі належнай кваліфікацыі. Да работы над операй «Дрыгва» тэатр яшчэ нават не прыступаў. Склад пастановачнай брыгады не вызначан. Што датычыцца оперы «Пагранічнікі», дык тут нават яшчэ няма лібрэта, якое аўтар абяцае здаць толькі ў жніўні.

Балет «Салавей» таксама яшчэ не мае пастаноўшчыка, а выпуск яго намечан 1 снежня.

Тэатр яшчэ не мае галоўнага дырыжора і галоўнага рэжысёра. Няма цэлага раду кваліфікаваных спевакоў, без якіх нельга пачаць сезон. А партарганізацыя спакойна сузірае гэтае становішча і ніякіх эфектыўных мер для выпраўлення агіднасцей у тэатры яшчэ не прыняла.

Агульны сход работнікаў тэатра, які адбыўся ў маі, даў рэзка алмоўную ацэнку дзейнасці дырэктара і мастацкага кіраўніка тэатра тав. Ярыкава. 4 чэрвеня сход партарганізацыі тэатра таксама прызнаў, што тав. Ярыкаў адарваўся ад калектыва і з работай не справіўся, а таму павінен быць вызвален ад работы ў тэатры. Прыняўшы правільную пастанову, партком не паклапаціўся аб хутчэйшай рэалізацыі яе.

У партарганізацыі ёсць нездаровыя з'явішчы — беспрынцыпныя спрэчкі паміж кіраўнікамі тэатра і факты бытавога разлажэння асобных комуністаў, а партвыхаваўчая работа ў тэатры наладжана вельмі дрэнна. Усе комуністы незалежна ад палітычнага ўзроўню знаходзіліся ў адным гуртку па гісторыі партыі. Дрэнна пастаўлена палітыка-масавая работа сярод беспартыйных. Група спачуваючых у такім вялікім калектыве налічвае ўсяго 2 асобы. Па ўласнаму прызнанню сакратара парткома тав. Шмакава, комсамольскай арганізацыяй кіруе чалавек, які не забяспечвае бальшэвіцкага кіраўніцтва комсамолам. А партком мірыцца з гэтым і не робіць ніякіх арганізацыйных вывадаў.

Нічога не робіць мясцком тэатра, на чале якога знаходзіцца комуніст тав. Кецлах. На агульным сходзе работнікаў тэатра ўскрыты рэшткі групаўшчыны сярод творчых работнікаў, якія распальваліся няправільнай тарыфікацыяй заработнай платы. І тут партком не праяўляе дастатковай рашучасці і ініцыятывы, чакаючы нейкага даведачніка з Упраўлення па справах мастацтваў. Вельмі марудна ідзе ў тэатры вылучэнне маладых таленавітых работнікаў, творча вырасшых за апошнія годы.

Партком і яго сакратар тав. Шмакаў ад ролі пасіўнага сузіральніка агіднасцей, якія робяцца ў тэатры, павінны стаць на шлях баявой бальшэвіцкай работы па выкарчоўванню шкодніцтва.

Ф. МІХАЙЛАЎ.



«У паход». Карціна мастака Ф. С. Багародскага. (СФ).

ЖАН-ЖАК РУСО

Да 160-годдзя са дня смерці

Пяцьдзесят год вандраваў Жан-Жак Русо па свету і сусветная слава хадзіла за ім, і валодаў ён думамі свайго веку. Побач з імем Вольтэра імя Русо зрабілася сімвалам эпохі.

Сын жэнеўскага рамесніка, Русо быў сапраўды плебей. Усё сваё жыццё ён пражыў у нястачы. Ен вельмі блізка ведаў цяжкае становішча народа і абурэнне супроць буржуазнага ладу перапаўняла яго. Ен бачыў няроўнасць паміж жыццём буржуазіі і працоўнымі масамі і на працягу ўсяго свайго жыцця шукаў першапрычыну гэтай няроўнасці.

І калі Дыжонская Акадэмія навук абвясціла прэмію за лепшы твор на тэму «Ці садзейнічала развіццё навукі і мастацтваў паляпшэнню ці псаванню нораваў?», Русо ў сваім выдатным «Разважанні аб навуках і мастацтвах» адказаў: «Уласнасць—вось, на маю думку, першапрычына ўсякай грамадскай няроўнасці. Навукі і мастацтвы выраслі на глебе, ўкормленай цяжкай працай народа, яго пакутлівай нястачай».

Ен гаварыў аб тым, што стары свет прагніў наскрозь і што ўся яго культура на самай справе ёсць ілжэ-культура, якая не патрэбна народу.

У сваім творы «Разважанні аб паходжанні і прычынах няроўнасці паміж людзьмі» Русо прыходзіць да рэвалюцыйнага вываду, што скінуўшы прыгнятальнікаў, народ адкрывае магчымасць устанаўлення сапраўднай роўнасці.

«Вучэнне Русо, — піша Энгельс, — у першым сваім выкладванні, можна сказаць, бліскуча выяўляе пячатку свайго дыялектычнага паходжання... няроўнасць зноўку ператвараецца ў роўнасць, але не ў старую натуральную роўнасць першабытных людзей, пазбаўленых мовы, а ў вышэйшую роўнасць—грамадскага дагавору. Прыгнятальнікі падвяргаюцца прыгнечанню. Гэта—адмаўленне адмаўлення.

Мы тут, такім чынам, маем у Русо ўжо не толькі разважанне, як дзве кроплі вады падобнае на разважанне Маркса ў «Капітале», але і ў падрабязнасцях мы бачым цэлы рад тых-жа дыялектычных зваротаў, якімі карыстаецца Маркс».

У гэтых словах Энгельса паказан рэвалюцыйны змест мысляй Русо аб няроўнасці.

Цывілізацыя і шчасце... Русо марыць аб тым, каб з'яднаць гэтыя «дзве несумяшчальныя рэчы». Але як? Якім чынам?

Абвінавачваючы ўласнасць, ён у той час мог толькі дагадвацца аб гэтым, а не верыць, што не пройдзе і двух дзесяцігоддзяў з дня яго смерці, як Французская рэвалюцыя знішчыць каралеўскія троны, што Робесп'ер зробіць сваім сцягам яго ідэі і светачам свайго шляху—яго творы.

Для Русо яго мары аб залатым веку «натуральнай» свабоды былі вышэйшай ісцінай. Абетаваная зямля ўвасобілася для яго ў царства яго дробнабуржуазнай утопіі. Капіталістычная рэчаіснасць, набліжаючыся, бязлітасна супярэчыла марам Русо. Ен пакутліва шукаў у самым сабе «добрадзейных» пачуццяў, тых самых бескарыслівых, шчырых пачуццяў, якіх ён не знаходзіць у акружаючых людзей. Адзін сярод асветнікаў, ён высоўвае прымат пачуццяў над розумам. Ен ставіць перад сабой альтэрнатыву—добрадзейства ці мудрасць, і не задумваючыся, вырашае яе на карысць добрадзейства. Ен забывае пры гэтым, што сам не раз выказваў і сцвярджаў, што добрадзейства і мудрасць—адзіная гістарычная прырода чалавека і неаддзялімы ў жыцці адно ад другой.

— Я прадпрыняў справу, якой не было прыкладу і не будзе пераймальнікаў. Мне падобным людзям я пакажу чалавека на ўсёй сваёй праўдзівай прыродзе. І гэты чалавек—я сам,—піша ён у сваёй славутай «Споведзі». Сам ён горда называе сваю «Споведзь» творам, якога яшчэ не было да гэтага часу і, напэўна, ніколі не будзе.

Калісь раман Русо «Юлія ці Новая Элаіза» настолькі захапіў Канта, што,



ЖАН ЖАК РУСО ў маладосці.
Рысунак Н. Гурло.

чытаючы яго, геніяльны філосаф, які славіўся сваёй метадычнай дакладнасцю, забыўся на свае звычайныя заняткі. Па аднаму гэтаму можна меркаваць аб якасці твораў Русо.

Русо—адзін з вялікіх рэалістаў XVIII стагоддзя; у імя шчасця народа ён змагаецца з тыраніяй, з грамадскай няроўнасцю. Русо—рэаліст, бо ён разглядае ўласцівасць чалавека—яго добрыя і злыя справы—як прадукт гістарычнага развіцця.

У 1763 годзе Русо назаўсёды адмовіўся ад праў грамадзяніна горада Жэневы. Ен звяртаецца да жэнеўцаў з наступнымі словамі.

— Вы не рымляне, не спартанцы; вы нават не афіняне. Пакіньце ў пакоі гэтыя вялікія імёны, якія вам зусім не падыходзяць. Вы гандляры, рамеснікі, буржуа, вечна заняты сваімі прыватнымі інтрэсамі, сваёй працай, гандлем і барышамі, для якіх сама свабода з'яўляецца толькі сродкам нажываць без перашкоды і валодаць без апаскі.

— Я наперад ведаю,—пісаў ён у сваім пісьме Рэйналю,—якімі гучнымі словамі на мяне нападуць. Свет, веды, закон, мараль, розум, дабро, абачлівасць, цiхамірнасць, прыемнасць, ветлівасць, выхаванне і т. д. На ўсё гэта я адкажу толькі двума іншымі словамі, якія яшчэ мацней гучаць у маім слуху. **Добрадзейства, ісціна!** Не пакіну я крычаць, **Ісціна, добрадзейства!** Мне няма чаго оказаць таму, для каго гэта пустыя словы.

І вялікі мысліцель угадаў. Ен стаў афярай класавага грамадства, якое забівае і калечыць сваіх геніяў. Русо быў зацкаван.

2 ліпеня 1778 года ў памесці Эрменвіль, якое належала графу Жырардэну, памёр вечны надроўнік, вялікі мысліцель і пісьменнік Жан-Жак Русо.

У совецкай краіне, дзе сапраўдная роўнасць і шчасце чалавецтва сталі законам жыцця, вялікі Русо атрымаў поўнае прызнанне як мужны барацьбіт за вызваленне чалавецтва.

ДА НАСТУПНАЙ СУСТРЭЧЫ!

2 ліпеня спектаклем «Апошнія» М. Горкага закончыў свае гастролі ў Менску Маскоўскі тэатр Рэвалюцыі. За паўтара месяца сваёй работы ў БССР тэатр паказаў працоўным Гомеля, Бабруйска і Менска рад выдатных спектакляў. Ва ўсіх гарадах БССР, дзе гастраліраваў тэатр Рэвалюцыі, ён быў цёпла сустрэты працоўнымі, якія з вялікай цікавасцю знаёміліся з спектаклямі тэатра. Найбольшым поспехам у гледача, па праву, карыстаўся спектакль «Праўда» А. Карнейчука — спектакль, у якім зроблена смелая спроба паказаць на сцэне вобраз геніяльнага правадыра працоўнага чалавецтва В. І. Леніна. Спроба, пры ўсіх недахопах, удалася, і ў гэтым вялікая заслуга драматурга, тэатра і ў асаблівасці актора М. Штрауха. Кожнае з'яўленне на сцэне вобраза любімага Ільіча выклікае буру апладысментаў і захапленне ў гледачоў.

«Праўда» — сапраўды гераічны, рэвалюцыйны спектакль. Проста і пераканаўча паказвае ён, як народ прыходзіў да вялікай праўды бальшэвіцкай партыі, як са зброяй у руках ён адваёўваў гэтую праўду, змагаючыся з панамі і капіталістамі, з меншавікамі і эсэрамі. Па-сапраўднаму хвалюе гледача вобраз селяніна-бедняка Тараса Галоты. Шлях, якім прышоў Тарас да партыі Леніна — Сталіна, — тыповы для мільёнаў працоўных горада і вёскі. Выканаўца гэтай ролі артыст Агейчанкаў стварыў глыбокі, хвалюючы вобраз. Творчую перамогу ў спектаклі «Праўда» атрымаў і артыст Астангаў, які вельмі тонка і ярка, не прыбягаючы да шаржа, раскрывае вобраз Керэнскага.

Нажаль, «Праўда» — адзіная ў цяперашнім рэпертуары Маскоўскага тэатра Рэвалюцыі п'еса пра Вялікую Кастрычніцкую рэвалюцыю і адзіная п'еса наогул на совецкую тэматыку. Ні аднаго спектакля на тэмы сёнешняга дня, адлюстроўваючага нашу соцыялістычную рэчаіснасць, не паказаў тэатр Рэвалюцыі нашым гледачам у гэты свой прыезд. Гэтая, яўна нездавальняючая, рэпертуарная лінія тэатра — вынік той неразбярыхі і разгубленасці, якая мелася ў кіраўніцтве тэатра на працягу апошніх год; вынік таго, што тэатр адарваўся ад свайго гледача. Гэта-ж прывяло і да таго, што не ўсе класічныя п'есы, пастаўленыя тэатрам Рэвалюцыі, раскрыты ім з належнай глыбінёй, не заўсёды яны гучаць з тою злобадзеннасцю, з якою павінны гучаць пры правільным раскрыцці п'есы. Поўная рэвалюцыйнага пафаса п'еса Лопе дэ Вега «Авечая крыніца» і бліскучая выкрываўчая п'еса вялікага пролетарскага пісьменніка А. М. Горкага «Апошнія» ў пастаноўцы тэатра Рэвалюцыі ў значнай ступені пацямнелі, згубілі сваю вастрату і рэвалюцыйную страстнасць.

Ідэйна выхалашчаным атрымаўся спектакль «Лесвіца славы» Э. Скрыба.

Аднак у сваёй рабоце над класічнай драматургіяй тэатр Рэвалюцыі мае нямала дасягненняў. На высокай мастацкай вышыні спектакль «Сабака на сене» Лопе дэ Вега, асабліва выканаўцы цэнтральнай ролі — Дзіяны — М. Бабанава і слугі Трыстана—Д. Орлоў.

Тое-ж трэба сказаць пра выдатны спектакль «Ромео і Джульета» В. Шэкспіра з Астангавым і Бабанавай у загалоўных ролях. У «Авечай крыніцы» хвалюючыя вобразы створаны артысткай Енюцінай (Лаўрэнсія) і Орловым (Менго). Есць аўторскія дасягненні і ў спектаклі «Лесвіца славы» і «Апошнія».

Другі раз прыязджае Маскоўскі тэатр Рэвалюцыі ў БССР. Ен дэманструе перад нашымі гледачамі жывую частку найлепшага ў свеце тэатральнага мастацтва — совецкага, неад'емную частку тэатральнага мастацтва вялікага рускага народа. Прыезды да нас тэатраў рускага народа і іншых народаў вялікага Совецкага Саюза, як і гастролі нашых тэатраў у іншых братніх рэспубліках — адзін з фактараў інтэрнацыянальнага яднання ўсіх народаў, складаючых Саюз Совецкіх Соцыялістычных Рэспублік.

Працуючы ў Менску ў дні падрыхтоўкі да ўсенароднага свята — выбараў у Вярхоўны Совет рэспублікі,— калектыў тэатра Рэвалюцыі актыўна ўключыўся ў перадвыбарчую кампанію, агітуючы мастацкімі сродкамі за кандыдатаў беларускага народа ў дэпутаты соцыялістычнага парламента. Акторы Маскоўскага тэатра Рэвалюцыі з радасцю аддалі свае галасы за першага кандыдата беларускага народа — за таварыша Сталіна.

Мы ўдзячны тэатру Рэвалюцыі за яго мастацтва, якое ён паказаў працоўным нашай рэспублікі. Тэатр мае вялікую колькасць бліскучых майстроў сцэны — заслужаных артыстаў рэспублікі М. Бабанаву, М. Штрауха, Д. Орлова, М. Астангава, О. Пыжову, Ю. Глізер, Г. Музалеўскага, артыстаў Агейчанкава, Енюціну, Страхаву і інш. Тэатр Рэвалюцыі ў гісторыі совецкага тэатра займае значнае месца. Ен адыграў вялікую ролю ў стварэнні совецкай драматургіі; рад п'ес Н. Пагодзіна, Вс. Вішнеўскага, А. Глебава, Н. Зархі і інш. упершыню ўбачылі свет на сцэне тэатра Рэвалюцыі. За 15 год работы тэатра стварыў шмат высокамастацкіх спектакляў, якія ў свой час станавіліся ў цэнтры ўвагі ўсёй тэатральнай грамадскасці і мелі вялікае значэнне для далейшага развіцця совецкага тэатральнага мастацтва.

Жаданне ўсіх нас, гледачоў тэатра Рэвалюцыі, — каб тэатр далей рос і мацнеў, каб ён хутчэй вышаў з «крызіснай» паласы, у якой апынуўся ў апошні час, каб ён моцна звязаўся з совецкімі драматургамі і з сваім гледачом і стварыў шэдэўры тэатральнага мастацтва — праўдзівага, глыбокага, хвалюючага, выхоўваючага масы ў комуністычным духу — совецкага тэатральнага мастацтва.

З вялікай цікавасцю наш глядач будзе чакаць наступнай сустрэчы з Маскоўскім тэатрам Рэвалюцыі.

Ю. Дворкіна

ГІ ДЭ-МАПАСАН

ДА 45-Й ГАДАВІНЫ СА ДНЯ СМЕРЦІ

6 ліпеня мінае 45 год з дня смерці вядомага французскага пісьменніка Гі дэ-Мапасана.

Нарадзіўся ён у 1850 годзе ў збяднеўшай дваранскай сям'і. Калі яму было трынаццаць год, яго аддалі вучыцца ў духоўную семінарыю. Аднак ужыцца там ён не змог. Праз чатыры гады Мапасана з семінарыі выключылі. Повадам для выключэння з'явілася перахвачанае начальствам вершаванае пісьмо, у якім малады Мапасан вельмі непачціва адзываўся аб духоўных асобах семінарыі.

Мапасан пераходзіць вучыцца ў ліцэй, канчае яго ў 1869 годзе. У 1870 годзе ён прымае ўдзел у франка-прускай вайне, робіць некалькі паходаў. Пасля вайны Гі дэ-Мапасан быў вымушаны паступіць на службу ў адно з міністэрстваў з прычыны дрэннага матэрыяльнага становішча сям'і. Але з 1880 года ён цалкам аддаецца літаратуры і службу кідае. У 1892 годзе ён захварэў на псіхічную хваробу і 6 ліпеня 1893 года памёр у псіхіятрычнай бальніцы.

Гі дэ-Мапасан пачаў сваю літаратурную творчасць як паэт. Але вялікага значэння яго вершы не мелі. Хутка ён пераходзіць да прозы. Вядомы пісьменнік Густаў Флобер быў другам сям'і Мапасанаў і блізкасць Мапасана да гэтага выдатнага майстра стылю зрабіла надзвычай спрыяючы ўплыў на пісьменніка. Флобер паставіў сваёй мэтай выхаваць у Мапасану сапраўднага мастака. Ен кіруе вучобай маладога пісьменніка, крытычна разбірае яго пісанні, бязлітасна бракуе нягоднае. Апрача таго Флобер і вучыў Мапасана літаратурнай тэхніцы, растлумачваў асноўныя прынцыпы мастацкай творчасці, вучыў старанна працаваць над сваім стылем і пазбягаць танных эфектаў. Самае выдатнае ў Мапасану тое, што ён цярпліва вучыцца мастацкаму майстэрству, шмат працуе, піша, але цэлых сем год устрымліваецца ад друкавання няспелых твораў.

У канцы 70-х гадоў Мапасан зблізіўся з групай французскіх натуралістаў на чале з Заля. Яны задумалі выдаць зборнік апавяданняў, які-б зацвердзіў асноўныя прынцыпы іх адносін да рэчаіснасці. Тэмай зборніка з'явілася падача эпізодаў з эпохі франка-прускай вайны. Зборнік гэты пад назваю «Меданскія вечары» вышаў у 1880 годзе. Буржуазная крытыка вельмі адмоўна аднеслася да яго, таму, бо тэмы франка-прускай вайны трактаваліся зусім не ў духу шавінізма. Аднак, ніхто не мог замаўчаць і абыйсці высокіх мастацкіх вартасцей, змешчанай у зборніку навелы Мапасана «Пышка». Гэтая навела вядома совецкаму чытачу і па кінокарціне. Поспех «Пышкі» быў надзвычай вялікі. З гэтага часу Мапасан цалкам аддаецца літаратурнай дзейнасці.

Дзесяцігоддзе з 1880 па 1890 г. характэрна незвычайнай пладавітасцю творчай дзейнасці пісьменніка. Кожны год выпускае ён па два-тры зборнікі навел. За гэтыя дзесяць год выпусціў ён шэсць раманаў. Увогуле Мапасан апублікаваў зборнікі вершаў, больш 300 навел, шэсць раманаў, тры томы падарожных нарысаў і вялікую колькасць журнальных артыкулаў.

Найбольшую каштоўнасць у літаратурнай спадчыне Мапасана маюць, бясспрэчна, яго апавяданні і раманы. У іх ён выступае як выдатны рэаліст, тонкі назіральны мастак, які ўмее заўважыць і паказаць тыповыя бакі жыцця, стварыць верную карціну сваёй эпохі.

Цікавы погляды Мапасана на метад мастацкай творчасці. На яго думку, пісьменнік не павінен у сваіх творах адводзіць месца разважанням. Ен павінен перш за ўсё ўмець бачыць жыццё і выкарыстоўваць для сваіх твораў канкрэтныя жыццёвыя факты. Але, апрача таго, Мапасан зусім правільна сцвярджаў, што назіранне—гэта яшчэ не ўсё. Мастак павінен умець знайсці тыповыя рысы з'явы і зрабіць іх мастацка выразнымі. «Мастак-рэаліст павінен нярэдка выпраўляць падзеі на карысць праўдападобнасці», — піша ён у прадмове да рамана «П'ер і Жан», і далей: «Мастак-рэаліст павінен даваць не банальную фатаграфію жыцця, а больш дасканалы, больш захапляючы паказ яго, чым сама рэчаіснасць».



Першым раманам Мапасана з'яўляецца яго раман «Жыццё» (1883 г.). У гэтым рамане пісьменнік выступіў як песіміст, расчараваны ў жыцці, як прарок роспачы. Ен вывеў гераіню, абаяльную, маладую, жыццерадасную дзяўчыну Жанну і паказаў, як здзекавалася жыццё над цудоўнымі яе марамі. Такім чынам, з самага пачатку сваёй творчасці Мапасан цвяроза ацаніў буржуазную рэчаіснасць і рэзка яе асудзіў. У Мапасану каштоўным з'яўляецца тое, што ён, як чуткі, уважлівы і назіральны мастак улавіў пах тлення і загнівання буржуазнага грамадства. Цвярозы паказ Мапасанам язваў імперыялістычнай Францыі, выкрыццё цынізма, прадажнасці, разбэшчанасці яе кіруючай клікі зліваліся з пратэстам шырокіх мас французскага народа супроць зверскага панавання фінансістаў і спекулянтаў, разараўшых народныя масы. У сэнсе паказу шырокай карціны жыцця Францыі, лепшымі раманамі Мапасана з'яўляюцца раманы «Мілы друг» і «Монт-Орыоль», асабліва першы.

Раман «Мілы друг» ва ўсёй сваёй аголенасці паказвае брудныя, прадажныя норавы кіруючай клікі. Прадажнасць дэпутатаў і міністраў, шалёная пагоня за ўзбагачэннем, сувязь кіруючых колаў з біржай, мутны паток разбэшчанасці, подкупу, — усё гэта шырока разгорнута ў рамане «Мілы друг». У асобе фінансіста-біржавіка Вальтэра, выдаўца бруднай бульварнай газеткі, Мапасан выкрывае буржуазную прэсу. Гэтая газетка напаўняецца заўсёды плёткамі, паклёпамі, газетнымі вуткамі, выгаднымі яе гаспадару. Але гэтая брудная газетка мае сілу: яна звяргае міністэрства, робіць уплыў на біржу, таму што за ёю стаіць Вальтэр, уладальнік вялікага багацця. Грошы—вось некаранованы ўладальнік свету. І пагоня за грашыма—асноўны імпульс жыцця ўсіх гэтых правіцеляў Францыі.

На гэтым яркім фоне палітычнага і грамадскага жыцця робіць галавакружальную кар'еру унтэр-афіцэр Жорж Дзюруа. Гэты наглы, цынічны, малакультурны чалавек заваёўвае сабе месца ў жыцці іменна таму, што ў даны момант нагласць і жорсткасць вызначаюць усё. Такое-ж крытычнае выкрыццё, праўда, крыху больш звужана, прадоўжваецца і ў рамане «Монт-Орыоль». Тут пісьменнік зноў паказвае свет дзяльцоў, спекулянтаў і супроцьставіць гэтаму свету цудоўнае, узбышанае каханне гераіні. Але гэтыя ідэальныя пачуцці растоптваюцца бруднымі разлікамі, пагоняй за багаццем. У «Жыцці» і ў «Монт-Орыолі» з сумам канстатуе Мапасан няўмеснасць чыстых, найлепшых пачуццяў і мараў у свеце гандляроў і спекулянтаў.

У сваіх раманах Мапасан праявіў сябе тонкім псіхолагам, майстрам паказу самых глыбокіх, інтымных перажыванняў. Але асабліва каштоўны для нас Мапасан як навеліст. Ен увасрасіў выдатны жанр кароткіх апавяданняў. Навела — кароткае апавяданне, у аснове якога ляжыць адзін які-небудзь эпізод. Канкрэтны факт падаецца ім заўсёды лаканічна, драматычна. Тэхніка навелы Мапасана цудоўная. Кожную навелу пачынае ён адразу, не ўжываючы дарэмных слоў на разважанні і адступленні. Кульмінацыйны пункт навелы ляжыць звычайна амаль у самым яе канцы. Двума-трыма эфектнымі, удалымі штрыхамі вырашае затым Мапасан поўную сітуацыю.

Па сваёй тэматыцы навелы падзяляюцца на некалькі груп. Асабліва моцныя сваёй выкрываўчай сілаю тыя навелы, у якіх пісьменнік раскрывае псіхалогію французскай буржуазіі і чыноўніцтва. Ен ускрывае прагнасць, скупасць буржуазіі, яе драпежную любоў да грошай, адсутнасць якіх-небудзь гуманных чалавечых пачуццяў («Зонцік», «Пьеро», «Пляцельшчыца крэслаў»). У кожнай навеле пад знадворна бясстрасным тонам гучыць самая рэзкая сатыра на гэтае грамадства. Да гэтага-ж цыкла далучаецца і група нармандскіх апавяданняў («Д'ябал», «Хрэсбіны», «Нармандзец»), дзе Мапасан у вельмі цёмных фарбах малюе быт і норавы нармандскай вёскі, панаванне там цемнаты, забабонаў. Ен не здолеў убачыць працоўнага сялянства, ён быў далёкі ад яго. Але затое пісьменнік цудоўна паказаў тыпы французскіх кулакоў, іх напоўжывёльную грубасць, прагнасць, скупасць («Дзядзька Амабль», «У моры» і інш.).

Трэба адзначыць і групу навел са свецкага жыцця, дзе пісьменнік паказвае нікудышнае жыццё свецкіх гультаёў, іх любоўныя прыгоды. Вядома, не ў іх сіла майстэрства Мапасана. Можна ўказаць і на групу так званых псіхалагічных навел, дзе пісьменнік аналізуе псіхіку вар'яцеючых людзей. У гэтых навелах выявілася ўся глыбіня песімізма і роспачы Мапасана («Ен?», «Харчэўня», «Ноч»). Не бачачы выхаду з гнілі і разлажэння грамадства, Мапасан супроцьставіў яму прыроду. Прырода добрая і цудоўная, — заяўляў ён, але чалавек скаверкаў і знявечыў яе ў сабе.

Мастацкая спадчынаа Мапасана мае для нас вялікае значэнне. Яна ўладае вялікай пазнавальнай цэннасцю. У навелах і раманах Мапасан разгарнуў значную карціну грамадскага, соцыяльнага і бытавога жыцця французскага грамадства 70—80-х гадоў. Ен разгарнуў галерэю вобразаў, увасабляючых усе агідныя бакі эпохі перарастання буржуазнага грамадства ў стадыю імперыялізма. Але, апрача таго, творчасць Мапасана мае вялікае значэнне і ў сэнсе літаратурнай вучобы. Здзіўляючай здольнасць падмячаць у жыцці тыповыя, абагуленыя рысы, уменне выказаць іх сцісла, каротка, пластычна — характарызуе стыль Мапасана. Рэалізм яго навел, іх выкрываўчая сіла шмат выйграюць дзякуючы лаканічнасці, дакладнасці мовы і выяўленчых сродкаў. Бязлітасна адкідваць усё другараднае, няважнае, неіснуючае, перадаваць дакладна, лаканічна, скупа ўсе адценні чалавечых пачуццяў і перажыванняў, не раскідвацца на другарадныя дэталі і дробязі — гэтаму вучыць літаратурная спадчына Мапасана. Тэхніцы выразнасці і лаканізма вучыўся ў Мапасана Талстой, вучыўся Чэхаў. Гэтаму майстэрству могуць і павінны вучыцца совецкія пісьменнікі. І трэба яшчэ адзначыць вялікую патрабавальнасць Мапасана да самога сябе, яго ўпартую работу над словам, над стылем. Совецкія пісьменнікі адкінуць, вядома, хваравітыя, упадніцкія элементы творчасці Мапасана і, крытычна перамагаючы яго спадчыну, здолеюць многа ўзяць і многа чаму навучыцца ад рэалізма Мапасана.

КІНО

„Маленства Горкага“

На экране высокі падлетак Пешкоў. Вакол яго агідны, звярыны, давячы сваім жывёльным аблiччам, скажоны быт. У хлопчыка нейкая не па-дзіцячаму прагная дапытлівасць да людзей і прыроджаная непахісная вера ў тое, «што яркае, здаровае і творчае» «ўсё-ж такі пераможна прарастае» скрозь «пласт усякай жывёльнай дрэні». Гэта не перакананне, а жыццёвая сутнасць чалавека, які нараджаецца добрым і разумным, але які з ранніх год аказваецца скаваным у якуюсьці дрэнную, бессэнсную качку самавараў і падушак, папояк і лаянкі. Ад яе ўсё жыццё здаецца чалавеку нудным і прыдушаным. Аднак, аб ім не раскажаш. «Гарачы туман узаемнай варожасці ўсіх з усімі: яна атручвала дарослых, і нават дзеці прымалі ў ёй гарачы ўдзел». Над чалавекам верхаводзіў кандовы быт. Трэба было быць вельмі моцным чалавекам: нарадзіцца і вырасці ў такім быту, адчуць у сабе чалавечае і пранесці яго не распырскаўшы, скрозь гэты драпежніцкі быт «узаемнай варожасці ўсіх з усімі».

Аляксей Пешкоў пранёс. На экране ён хлопчык 10—12 год. Калі падлетак вырасце і стане вялікім прызнаным пісьменнікам, вялікім другам чалавецтва і гарачым любімцам людзей, да Пешкова — Горкага прыдуць чужыя чалавекападобныя цені з агіднага мінулага, чалавекападобныя цені ў вобразе трацкісцкіх бандытаў і смуродным сваім дыханнем абарвуць жыццё Аляксею Пешкову — Максіму Горкаму. Ад гэтай мыслі цяжка адыйсці, калі глядзіш фільм. Кожны крок і кожны ўчынак маленькага Пешкова бясконца пашыраецца ўсёй канвой непаўторнага горкаўскага жыцця. Адчуваецца за кожным крокам хлопчыка той велізарны разбег, і тое шырачэзнае размінанне багатырскіх плеч, якое спатрэбілася для праходжэння жыцця, падобнага да горкаўскага. За маленькім Пешковым паўстае дарослы Горкі. Можа быць, нават вельмі выразна, у тым сэнсе, што гэта параўнанне нядоўгага дзіцячага перыяда з усім жыццём Горкага і жаданне ўбачыць усё гэта жыццё ў маленстве не дазваляла аўтарам фільма да канца даверыцца хлопчыку Пешкову. Здавалася-б, што фільм будзе цяжка глядзець: у ім будзе цесна ад самавараў і падушак.

Жорсткая і цяжкая праўда скнарлівасці, мяшчанства, прыгнечання і ўціску, неспыняючаяся барацьба за ўласнасць перанесена ў фільм з усёй сваёй жыццёвай непрыгляднасцю. Гэта жорсткая праўда не робіць таго змрочнага ўздзейнічання, якога можна было чакаць. Выратавала горкаўскі погляд на жыццё яго непахісная вера ў чыстае, творчае, здаровае, якое пераживае поўную і жывучую праўду быта. Нават самыя страшэнныя сцэны і эпізоды фільма маюць у сабе нейкі другі «аблагараджваючы» іх план. У фільме прысутнічае настойліва-аптымістычная мысль, якая паслядоўна, абсалютна свабодна і натуральна праводзіцца праз усе сцэны і эпізоды фільма. Да чаго страшэнны вобраз бязногага хлопчыка з апавядання «Страсти-мордасти», які марыць пра «чыста-поле», якога ні разу не бачыў? І колькі паветра і прастора, якая яснасць у заключным эпізодзе фільма, калі ватага хлапчукоў вывозіць бязногага ў «чыста-поле»! У далечынь, у вялікую радасную мару аб лепшым чалавечым жыцці плыве, бесклапотная песенька дзяцей:

Город на Каме,
Где — не знаем сами!
Не достать руками,
Не дойти ногами!

Такая-ж мысль аб неспыняючымся жыцці, аб чалавечай надзеі на лепшае будучае паказваецца ў вобразах бабкі (народная артыстка РСФСР В. Масаліцінава). Гэта аб ёй, аб гэтай бабульцы Горкі пісаў: «Да яе як-быццам спаў я, схаваны ў цемрадзі, але з'явілася яна, абудзіла, вывела на святло, звязала вакол мяне ў непарыўную ніць, спляла ў рознакаляровыя карункі і адразу стала на ўсё жыццё другам, самым блізкім сэрцу майму, самым зразумелым і дарагім чалавекам, — гэта яе бескарыслівая любоў да свету ўзбагаціла мяне, насыціўшы моцнай сілай для працоўнага жыцця» («Маленства»). Такая бабка — Масаліцінава. Сама яе дабрачыннасць, давер'е да людзей і жыцця, чалавечая цеплыня і народная мудрасць — з'явілася ў жыцці хлопчыка Горкага той іскаркай, якая сагравала яго ва ўмовах душнага і нязграбнага купецкага свету. Прастата і натуральнасць бабкі служыла сцверджаннем таго, што людзі самі па сабе добрыя і разумныя, што робіць іх злымі і зверападобнымі ўвесь ненавісны ўклад уласнасці. І дзед, які бесчалавечна катуе Аляксея, і той не пазбаўлен чалавечых пачуццяў. Актор Траяноўскі, які выконвае ролю дзеда, добра зразумеў мысль Горкага, калі адмовіўся ад прымітыўнага, і «злодзейскага» выраша́ння вобраза. «Дзед не злы і не страшны». Гэта жыццё робіць яго такім.

«Маленства Горкага» — добры фільм аб вялікім пісьменніку, вялікім гуманісце.

Г. РОСІН.

Аляксей КОРШАК

У акне

Простае, звычайнае здарэнне.
Думы-ж—паспрабуй іх—супыні?
З поўным песень радасных бярэм'ем
Ластаўка мільгнула ў вышыні.

Погляд твой сачыў з акна: стралою
Жвава праімчалася яна,
Села на вяршку кудлатай хвоі,
Вырасшай ля самага акна.

Ціха пасядзела. Спачывання
Доўга не сцярпела. У вышыню
Успырхнула і ў сінім акіяне
Песні панясла насустрач дню.

Шчасная ў паветраных абшарах
Весела купалася яна.
Потым знікла ў небе нібы мара —
Сіняя ўтапіла вышыня.

Знікнула... Ты поглядам за ёю
Доўга ў далі ясныя плыла,
Сэрца агарнулася тугою
Лёгкаю, як майская імгла.

Мілага, напэўна, вобраз любы
Дум паклікаў сонечных палёт.
Дзе ён чорнавокі, чорначубы
Сёння свой кіруе самалёт?

Мо над сенажаццю, ці шырокім
Морам зеленеючай тайгі...
Як ляціць ён—нізка, ці высока,
Сумны, ці вясёлы, дарагі?

Пэўна, шлях любімаму далёкі,
Гэткі, як і ў радасным жыцці...
Хутка, ці не хутка чорнавокі
Любую пабачыць прыляціць?

Простае, звычайнае здарэнне:
Птушка мільганула— і ўсяго.
Колькі-ж незвычайных лятуценняў,
Клопатаў і думак ад таго.

НЕ СПІЦЬ ГРАНІЦА!

У сэрцы з нянавісцю брудная,
З халодным «Смітам» у руках,
Паўзе бандыт, паўзе марудна
Глухою ноччу па кустах.

Чаго патрэбна супастату?
Вядома, нават не пытай:
Яшчэ поўкрока—і мяжа тут,
А за мяжой—Савецкі край.

Нябачных хвой высокіх пікі...
Што будзе — ўдача ці правал?
О, страшны крок у край вялікі!
Мяжа — смяротэльны перавал.

Пара! І зроблен крок драпежны.
Мяжа парушана. Шпіён
Паўзе далей. У мгле бязмежнай
Ягоны шорах не чуцён.

Злачынец зброю сціснуў з сілай,
Трывогу ў сэрцы нясучы,
Паўзе да ўласнае магілы,
Што падрыхтавана ўначы.

Шалёна сэрца б'ецца, рвецца
Далей, далей-бы ад мяжы.
І радасна, яму здаецца —
Усё прайшло, ён будзе жыць.

Раптоўна—Стой!—Як гром. Ад страху
Нібы застынуў сэрца стук.
Бандыт ускінуў зброю з жахам
І стрэліў тройчы ў цемнату.

Прыжок у бок... Не спіць граніца!
Ад нас ніхто яшчэ не ўцёк!..
І куляй меткай пагранічнік
Закрэсліў бруднае жыццё.

КОПЫЛЬ.

—О—

Н. СУРНАЧОЎ

НАКАЗ

Песню звонкую Анэта
Разгубіла ў мурагах;
Праплыла яна, як лета,
Разлілася па лугах.

«Ранкам чэрвеньскім пад дубам
Цалаваў мяне Лявон —
Палымнелі мае губы,
Сэрца біла, нібы ў звон.

Люба нам было кахацца!
Дні міналі быццам сон.
Але ў жніўні развітацца
Да мяне прыйшоў Лявон.

Сэрца к сэрцу прытулялі —
Сэрцы гутарку вялі,
Думы юныя крылялі,
Песняй-птушкаю плылі

Там, дзе сонца палыхае,
Шле адкуль цяпло на дол,
Дзе вясёлка залатая
Абмываецца вадой.

Я Лявонку ключавою
Той вадзіцай абдала,
За сялібы ярыною
У пуць-дарогу правяла.

Цалавала, варкавала
І наказ такі дала:
Каб радзіма красавала
Ад сяла і да сяла;

Каб злы вораг не сваволіў,
К нам не лез з па-за мяжы, —
Нашу шчасце, нашу волю
Пільна, любы, беражы».

НА ПАСЯДЖЭННІ ПРАЎЛЕННЯ ССПБ

3-га ліпеня адбылося пасяджэнне Праўлення ССПБ.

З інфармацыяй аб плане работ па напісанню гісторыі беларускай літаратуры выступіў тав. М. Ларчанка — прадстаўнік Інстытута ЛІМ Беларускай Акадэміі навук.

Выступіўшы тт. Клімковіч, Кучар, Гурскі, Дворкіна М., Лынькоў і інш. востра паставілі пытанне аб вялікай адказнасці, ускладаемай на калектыў аўтараў і на ўвесь Саюз пісьменнікаў гэтай работай, якую не раз зрывалі ворагі народа, арудваўшыя ў Інстытуце літаратуры.

Праўленне ССПБ зацвердзіла рад канкрэтных мерапрыемстваў па ўдзелу пісьменнікаў у напісанні гісторыі літаратуры. У дапамогу аўтарскаму калектыву Інстытута літаратуры вылучаны тт. Крапіва, Клімковіч, Глебка, Кучар і Шарахоўскі. У якасці кансультантаў зацверджаны Янка Купала, Якуб Колас і Змітрок Бядуля.

У рабочую рэдакцыю гісторыі ад Саюза пісьменнікаў уведзены тт. М. Лынькоў і Кузьма Чорны.

Праўленне абмеркавала пытанне аб удзеле пісьменнікаў у святкаванні дня вызвалення Беларусі ад белапалякаў.

На гэтым пасяджэнні прынята пастанова аб скліканні курсаў пачынаючых аўтараў у жніўні гэтага года.

Крытык тав. Дворкіна прынята ў члены Саюза савецкіх пісьменнікаў, а тав. Ларчанка ў кандыдаты саюза.



Кадр з кіно-фільма «Маска» па аднайменнаму твору А. П. ЧЭХАВА.

ЧЭХАЎ НА ЭКРАНЕ

(АБ КАРЦІНАХ «МЯДЗВЕДЗЬ» і «МАСКА»)

У свой час рэалістычную праўду жыцця ў творчасці Чэхава называлі дробным псіхалагічным калупаннем. Бадай і цяпер яшчэ некаторыя літаратурныя недарослі глыбока ўпэўнены, што галоўнае ў творчасці Чэхава — гэта мастацтва псіхалагічнага нюанса і бытавой дэталі. Падобныя крытыкі не разумелі і не разумеюць, што геніяльнае майстэрства найтанчэйшай ювелірнай аддзелкі чэхаўскіх вобразаў поўнасцю было накіравана на яснае раскрыццё ў іх мыслі, усё жыццё хвалявaўшай вялікага пісьменніка.

А хвалявала яго думка аб перабудове жыцця, якое асуджала дробных людзей на пошлае і бясследнае існаванне. Што можа быць страшэнней і бессэнсней жыцця, якое не пакінула пасля сябе ніякага следу! Усё сваё нядоўгае творчае жыццё Чэхаў прысвяціў гэтай тэме.

У кінематаграфіі доўгі час не разумелі гэтай тэмы чэхаўскай творчасці. Вось чаму аб'ектыў кіноапарата да гэтага часу не зазіраў у старонкі чэхаўскіх твораў.

У свой час была адна нясмелая, але ўдзячная спроба экранізаваць некалькі чэхаўскіх навел пад агульнай назвай «Чыны і людзі». Спроба была ўдалая. Народны артыст Масквін у кіно-навеле «Хамельон» стварыў неперайма́льны вобраз паліцэйскага надзірацеля Очумелава. У далейшым гэта работа чамусьці не была прадоўжана.

Беларуская кіно-студыя экранізавала ў гэтым годзе тры чэхаўскія творы: «Мядзведзь», «Маска» і «Налім». Тут можна адразу сказаць, што і гэта другая ў савецкай кінематаграфіі спроба ўдалася. Удалася ў сэнсе правільнага разумення ўзятых твораў і параўнаўча дасканалага перанясення іх на экран. Трэба прызнаць не зусім удалым самы выбар твораў для экранізацыі. Выбар для экранізацыі вадэвіля «Мядзведзь» і апавядання «Налім» больш чым выпадковы. Абодва гэтыя творы зусім не характэрны для асноўнай тэмы чэхаўскай творчасці. Яны менш за ўсё раскрываюць тэму чалавека здрабнелага, прыніжанага і маральна зняве́чанага жыццём царскай Расіі.

Тым не менш і адзін і другі твор з'явіліся ўдзячнай асновай для стварэння вясёлых кіно-камедый. Малады рэжысёр Аненскі, які ставіў «Мядзведзь», узяўся за цяжкую, але ўдзячную задачу. Усведамляючы, што жартаўлівы вадэвіль «Мядзведзь» пазбаўлен своеасаблівай сацыяльнай вайстрыні, уласцівай большасці твораў Чэхава, рэжысёр пачаў вельмі чула і ўважліва прыслухоўвацца да падтэкста вадэвіля. Чэхаў, як кожны вялікі мастак, вельмі высока цаніў творчасць, каб засмечваць яе дробнымі жартамі. У кожным жарце мастак хаваў крупіну свайго «я», частку сваёй заветнай творчай мыслі. Рэжысёр паставіў сваёй задачай — знайсці гэтыя крупіны і, спалучыўшы іх у адно цэласнае, стварыць вобразы найбольш блізкія і арганічныя асноўнай тэме Чэхава. У вадэвілі і ў карціне асноўнай лініяй праходзіць сутычка двух рознародных пачуццяў. І рэжысёр з акторамі вельмі ярка і пераканаўча падкрэслілі пошласць і нікчэмнасць гэтых пачуццяў. У выдатнай і тонкай ігры засл. арт. Андрэўскай (МХАТ) няма і кроплі намёку, што смерць мужа Паповай пакінула ў яе сэрцы сапраўды незабыўнае гора, як яна запэўнівае сябе на словах. У сапраўднасці такія нікчэмныя натуры няздольны ні глыбока пакутваць, ні глыбока любіць.

Перад рэжысёрамі і акторамі стаяла небяспека ўзяць ад Чэхава толькі віртуозную форму вясёлага вадэвіля і не знайсці для яе рэалістычнага апраўдання, заключанага ў Чэхава часам у непрыметных дэталях, нюансах, у руху мыслі і пачуццяў яго герояў. Але і ў карціне ўсё гэта знайшло сваё месца і загучала па-чэхаўску пераканаўча. Праўда, не ўсюды. Ёсць у карціне асобныя няправільна зразуметыя дэталі. У п'есе Чэхава ўдовушка Папова, расчуленая ўспамінамі аб сваім мужы, загадвае лакею даць лішнюю асьмушку аўса любімаму каню нябожчыка.

Але гэта «лішняя» асьмушка ніяк не вяжацца з пышнай гасціннай тыпу губернскай арыстакраткі і з манерамі жанчыны, якая пазнала задаволенні раскошнага жыцця. Гэтая дэталь, якая ў Чэхава раскрывала цэлы вобраз, незразумета рэжысёрам і мастаком.

К. ГУБАРЭВІЧ.

ЗМЯНІЦЬ НЕПРЫГОДНАЕ КІРАЎНІЦТВА

Газета «Літаратура і мастацтва» адзначала ўжо шкодныя з'явішчы ў рабоце Рагачоўскага калгаснага тэатра, указваючы на тое, што здольны малады калектыў не зможа правільна расці, калі яго кіраўніцтва не адмовіцца ад фармалістычных, мейерхольдаўскіх тэндэнцый.

Пытанні творчай вучобы неаднаразова ўзнімаліся ў тэатры, але яны не знаходзілі свайго вырашэння, таму што ў калектыве не разгорнута бальшавіцкая самакрытыка.

Нядаўна на агульным сходзе, на якім работнікаў тэатра, у прысутнасці прадстаўніка раённага камітэта партыі, абмяркоўваўся артыкул газеты «ЛІМ», было аднадушна прызнана, што ў маладым тэатры ў наяўнасці шмат нездаровых з'явішчаў. Зажым самакрытыкі, культывіраванне зазнайства і падхалімства з'яўляецца своеасаблівым метадам работы мастацкага кіраўніка тэатра Лізункова. Калектыў тэатра да гэтага часу не ведае свайго рэпертуарнага плана. Калектыў не абмяркоўваў ні адной сваёй пастаноўкі.

Вытворчы план работы кіраўніцтва тэатра пусціла на поўны самацёк. У сакавіку на скорую руку былі пастаўлены дзве п'есы, а потым амаль тры месяцы калектыў бяздзейнічаў (калі не лічыць некалькіх выездаў на раён) і толькі ў чэрвені прыступіў да работы над пастаноўкай п'есы Якуба Коласа «У пушчах Палесся».

Пасля гарачых прамоў і «ўрачыстых» абяцанняў наладзіць у тэатры работу Лізункоў без ведама калектыва выязджае на халтурную гастроль у адзін з клубаў Менска. Калектыў вымушан быў чакаць свайго «кіраўніка», бескарысна прагульваючы час. У выніку была сарвана падрыхтоўка да выбараў у Вярхоўны Совет БССР, сарваўся план выпуску прэм'еры «У пушчах Палесся», якую намечана было падрыхтаваць да 11 ліпеня — свята вызвалення Беларусі ад белапалякаў.

Імкнучыся палепшыць сваю работу, з поспехам прыйсці да ўсебеларускага фестываля калгасных тэатраў, наш калектыў выклікаў на соцспаборніцтва Мазырскі абласны тэатр. Акторы заключаюць паміж сабою дагаворы на лепшыя паказчыкі ў рабоце. Аднак, гэта важнейшае мерапрыемства можа застацца чарговай фармальнасцю, калі тэатр будуць узначальваць падобныя Лізункову «кіраўнікі».

Група акцёраў Рагачоўскага калгаснага тэатра: Б. ТАЛПЕГА, Б. САВІЧ, Е. ГАРОБЧАНКА, І. БАРАНОЎСКІ, В. ГАЛАНЦОЎ.

АД РЭДАКЦЫІ: Змяшчаючы гэта пісьмо, рэдакцыя патрабуе ад Упраўлення па справах мастацтваў неадкладнага ўмяшання ў справы Рагачоўскага калгаснага тэатра.



ТЭАТР ЮНАГА ГЛЕДАЧА БССР «Ноч у верасні» І. Чэкіна. Сцяпан Кулагін — арт. В. Чэмялоў, старыя шахцёры — С. Гуц і Н. Навіцкі.

„НОЧ У ВЕРАСНІ“

У ДЗЯРЖАЎНЫМ ТЭАТРЫ ЮНАГА ГЛЕДАЧА БССР

Тэатр юнага гледача паказаў новы спектакль — «Ноч у верасні» І. Чэкіна. Тэма спектакля—зачынанне стаханаўскага руху ва ўсесаюзнай качагарцы — Данбасе.

Стаханаўскі рух — гэта рэвалюцыя ў вытворчасці працы. Рэвалюцыя, якую пачалі асобныя рабочыя, была падхоплена ўсім рабочым класам магутнага Совецкага Саюза і адразу-ж ініцыятыва мас была ўзначалена нашай бальшавіцкай партыяй, якая пасунула яе наперад. Стаханаўскі рух, гэта рух перадавога ў свеце совецкага народа за ўзняцце культурна-тэхнічнага ўзроўню рабочага класа СССР, за паляпшэнне матэрыяльна-культурнага становішча краіны Советаў. Стаханаўскі рух—вышэйшая ступень соцыялістычнага спаборніцтва. Стаханаўцы ствараюць усе магчымасці да знішчэння супроцьлегласці паміж працай разумовай і працай фізічнай, а гэтым самым яны ствараюць усе магчымасці, неабходныя для пераходу ад соцыялізма да камунізма.

У п'есе «Ноч у верасні» І. Чэкін эскізна намаляваў шляхі, якімі стаханаўцы дамагаліся сваёй перамогі. Яны перавыконвалі план. Але як стаханаўцы дайшлі да гэтага перавыканання? Мусіць, не толькі спаборніцтвам са старымі шахцёрамі і перавыкананнем старых норм здолелі перамагчы стаханаўцы. Гэту перамогу забяспечыла бальшавіцкае авалоданне тэхнікай. Справа не толькі ў характары людзей, а ў іх культурна-тэхнічнай падрыхтаванасці. Гэту прычыну і забыў аўтар. Гутарка ідзе не наогул аб людзях, а аб стаханаўцах, якія з'яўляюцца перадавымі людзьмі нашай краіны. Гэта людзі новыя, яны—творцы соцыялістычнага грамадства. Аднак, гэтых людзей, у поўным іх выглядзе, аўтару не давялося стварыць. Многія дзеючыя асобы п'есы—схематычныя (напрыклад, Косця Ветраў, Ніна Дзідзенка).

Стаханаўскі рух з'яўляецца свядомай ініцыятывай рабочага класа. Гэта мы бачым у п'есе. Шахцёры, ахопленыя жаданнем вывесці сваю шахту з прарыву, змятаюць са свайго шляху шкоднікаў і ліквідуюць прарыў. На гэта іх натхнілі комуністычная партыя і яе правадыр таварыш Сталін, якія шмат крытыкавалі работу Данбаса і, нарэшце, дабіліся паляпшэння на гэтым участку. Гэта неабходна было чырвонай ніццю правесці праз усю п'есу.

Трафарэтна зроблены масавыя сцэны, а іх-бы якраз і можна было выкарыстаць для паказу, хто і як натхняў стаханаўцаў да гераічнай працы.

Драматург лепш паказаў старое пакаленне шахцёраў. Тут ён знайшоў шмат мастацкіх фарбаў для паказу ломкі старой псіхікі і нараджэння новых адносін да соцыялістычнай вытворчасці. У гэтым каштоўнасць п'есы.

Поспех спектакля «Ноч у верасні» залежыць ад акторскага выканання. У гэтым напрамку пастаноўшчык, заслужаны артыст БССР Е. А. Міровіч, і ўвесь калектыў выканаўцаў прарабіў значную работу па ўвасабленню персанажаў п'есы ў жывыя вобразы сучасных людзей. Рэжысёр у даным спектаклі больш звяртае ўвагі не на асобныя сцэны, эпізоды і мізансцэны, а на развіццё вобразаў, на чалавечыя асаблівасці асобных персанажаў. І правільна, бо людзі — аснова спектакля, які прысвячаецца стаханаўцам.

З усіх персанажаў трэба выдзеліць тры групы вобразаў: старых людзей, комуністаў і комсамольцаў, і шкоднікаў. На разглядзе іх мы зараз і спынімся.

Вобразы старых людзей. Іх у п'есе шмат, але нам хочацца звярнуць увагу на найбольш характэрныя.

Стары шахцёр Зайка (А. І. Матусевіч). Дзіўны ён чалавек. З аднаго боку, у ім жывуць старыя звычкі — цяга да жыцця «па старынцы», імкненне працаваць па-ранейшаму—ён любіць выпіць, не мае ўласнага погляду, а ва ўсім падначальваецца Антону. З другога боку, перамагаючы гэтыя недахопы, Зайка праяўляе і свой гонар, гонар старога шахцёра, патрыятычныя пачуцці да сваёй шахты, да свайго народа, да сваёй радзімы. Таму яго свядомасць рабочага-шахцёра бярэ верх над уласнымі старымі перажыткамі. У гэтым уся цікавасць, а адначасова і складанасць вобраза Зайкі. Актор Матусевіч стварыў змястоўны вобраз. Ён знайшоў у Зайкі цёплы гумар і дасціпнасць, што значна ўзбагачае гэты персанаж.

У супроцьлегласць Зайку можна паставіць Антона Кулагіна (Л. К. Буцько). Чалавек ён моцнай волі, упарты, а галоўнае —добры рабочы. Таму і карыстаецца вялікім аўтарытэтам сярод старых шахцёраў. Актору, на вялікі жаль, не ўдалося спалучыць унутраныя якасці гэтага чалавека з яго вонкавым выглядам. Выканаўца, нам здаецца, некалькі не зразумеў, што злосць і дэспатызм у сям'і адносяцца толькі да першай часткі сцэнічнай біяграфіі Антона, а не да ўсёй ролі.

І апошнім з групы старых шахцёраў трэба адзначыць Карася (Н. М. Навіцкі). Трапны гумар, жыццёвасць павадзін і прастата ўдала спалучаюцца ў гэтым вобразе.

Пачуццё гонару за сваю шахцёрскую справу яднае ўсіх гэтых людзей у адну сям'ю. Да яе-ж трэба яшчэ далучыць галоўнага інжынера Пушкарова. Праз гэты персанаж аўтар імкнуўся паказаць, што хоць навуковыя даследванні Пушкарова ўстарэлі, аднак ён не адрываецца ад шахцёраў, а сам спускаецца ў шахту разам са стаханаўцамі і пераконваецца, што яго навуковыя нормы сапраўды ўстарэлі. На вялікі жаль, вобраз гэты зроблен толькі на палову. Як аўтару, так і актору Г. С. Лаўрову ўдалася толькі камедыйна-бытавая частка вобраза.

Вобраз Соф'і Касьянаўны, жонкі Пушкарова, у выкананні М. К. Рэккель задушэўны.

Актрыса М. В. Заборская ў вобразе Марфы, жонкі Антона, на нашу думку, няправільна зразумела першую частку ролі. Яна іграе Марфу надзвычай забітай жанчынай. Інцыдэнт у сям'і Кулагіна трэба разглядаць як выпадак, які здарыўся на глебе хворага самалюбства Антона. Дарэчы, п'янка тут зусім не да месца. Яна нават перашкаджае дзеі. Клапатлівая маці і адданая жонка Марфа рады і шчаслівы, што сын і бацька дасягнулі вялікіх поспехаў у здабычы вугалю. У канцы ролі Заборская напаўняе вобраз Марфы сапраўднай жаночай ласкавасцю.

Стаханаўскі рух узбагаціў людзей новымі думкамі і пачуццямі,—вось які агульны вынік трэба зрабіць, гаворачы аб першай групе вобразаў.

Комуністы і комсамольцы — другая група вобразаў, якая ў пачатку п'есы супроцьпастаўлена старым шахцёрам, а потым сваім прыкладам пераканала старыкоў і ўцягнула іх у стаханаўскі рух. Здавалася-б, што гэтыя вобразы павінны былі быць напісаны ў п'есе больш дасканала. Але, на вялікі жаль, гэта далёка не так.

Актор В. В. Чэмелаў імкнецца зрабіць вобраз Сцяпана Кулагіна, палкага і імклівага комсамольца, ініцыятара стаханаўскага руху, вобразам абаяльнага чалавека. Актор перамагае некаторую надуманасць аўтара ў першай частцы вобраза. Выканаўца пайшоў далей аўтара, таму што ён насыціў вобраз адценямі чалавечага характару, ён знайшоў асаблівасці комсамольца Сцяпана, барацьбіта-стаханаўца.

Актрыса С. Я. Гурэвіч выпукляе ў вобразе комсамолкі Ніны Дзідзенка не тое, што трэба. Панічнасць і нявытрыманасць ніяк не з'яўляюцца характэрнымі рысамі сучаснай моладзі. Залішняе пакутванне ў бальніцы зніжае вобраз комсамолкі.

Адносна актора П. І. Бондарава, які выконвае ролю парторга Косці Ветрава, трэба сказаць, што ён не падыходзіць да гэтай ролі, а адсюль і ўсе памылкі. Тав. Бондараву больш удаюцца вобразы юнакоў.

Акторам гэтай групы трэба яшчэ шмат працаваць над сваімі вобразамі.

Да апошняй групы трэба аднесці вобразы шкоднікаў — начальніка шахты Паплаўскага (Р. І. Вайнштэйн) і галоўнага ўрача Стакоўскага (Л. М. Фрыдман).

Актор Фрыдман паўтарае сябе, бо аналагічны-ж вобраз шкодніка-дыверсанта ім быў зроблен у спектаклі «Наша зброя».

Праўдзівы вобраз шкодніка Паплаўскага стварыў актор Вайнштэйн. Замкнёнасць і хітрасць чалавека, які ўвесь увайшоў у сябе, не адразу раскрываюцца акторам. Выканаўца паказаў, што вораг дзейнічае тонка і да апошняй хвіліны маскіруецца пад совецкага грамадзяніна. Мярзотны твар трацкісцка-бухарынскага паслядыша быў выкрыт дзякуючы пільнасці рабочых, рабочыя перамаглі варожую хітрасць.

Добра выконваюць свае ролі Л. П. Цімафеева (Валя) і Ш. Ш. Сагальчык (Сліва).

Поспеху спектакля спрыяе змястоўная музыка кампазітара Е. К. Цікоцкага і Д. А. Лукаса і добра мастацкае афармленне, зробленае мастаком К. С. Елісеевым.

Мы спадзяемся, што Тэатр юнага гледача ўлічыць усе памылкі, якія ён дапусціў у першых паказах спектакля, і ў самы бліжэйшы час выправіць іх.

Спектакль «Ноч у верасні» патрэбны і актуальны спектакль, таму яго так добра прымае глядач.

А. ЕСАКОЎ.

Нам. рэдактара А. Р. ВАРАШЫЛАЎ.

Друкарня «Звязды». Газета «Літаратура і мастацтва» выходзіць адзін раз у пяцідзённу. Адрас рэдакцыі газеты: Менск, Савецкая, 76, Дом пісьменніка. Тэлефон 25-394. Уп. Галоўлітбела № Г—4713.